05

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

V



№11
КРАСАВІК
1931 г.

Трактарыстка-ўдарніца Койданаўскай машына-трактарнай станцыі тав. Вадаховіч.

Фото СЕМЯНЯКІ.

1832

Маладая Наталя

Агняцьвет

Яна ўся агнём гарыць,
у вачох гуляюць іскры
сьмеху.
Яна—
старэйшы брыгадзір
сьлясарна-зборачнага цэху.
На галаве—сівы сумёт.
Спавілі зморшчкі твар
Наталі.
Але ў сэрцы—сталі звон
і сьпеў гарачага мэталю...

—·—

Наталя помніць боек дым
і рэвалюцыі напорнасьць.
У гэтых сьценах завадзкіх
спазнала радасьць,
буры,
гора...
Быў сын. Задорны, малады.
Ён у атрадзе партызаніў.
Аднойчы...
У лесе...
Уначы...
Яго бандыты расстралялі.
І сэрца матчына
тады
Тугой крываваю стагнала...
Наталья помніць тыя дні.
Яны яе загартавалі...

—·—

Сьціх боек звон.
Завод ажыў.
Завод у працы агнязарыць
Натальля ўносіць свой
уздым,
Наталя—першая
з ударніц...

—·—

Варштатаў гул.
Бадзёры рух.
Сьлясарны цэх—увесь ударны.
Тут шмат працоўных,
лоўкіх рук.
Стракае
сілу нашых плянаў.
Натальля ўся гарыць агнём
за выкананьне пяцігодкі.
На галаве—сівы сумёт.
А ў сэрцы—
радасьць камсамолкі.

Дабіліся пералому ў справе пераваліфікацыі работніц

На менскай абутковай фабрыцы ёсьць вялікія дасягненьні ў справе ўкараненьня жаночай рабочай сілы. Калі ў 1924 годзе на фабрыцы працавала 1 работніца, у 1927 годзе—9, дык зараз у нас ужо налічваецца 333 работніцы.

Раней былі на фабрыцы такія настроі, што работніца можа быць толькі падсобніцай, прыбіральшчыцай ці працаваць на працэсе 1-га разраду. Доўгі час работніц не перасоўвалі на вышэйшую кваліфікацыю.

Зараз мы маем другое становішча: 128 работніц працуюць на вышэйшай кваліфікацыі і ў асноўным на рабоце сябе апраўдалі.



Тав. Яхновіч, лепшая ўдарніца заводу „Дрэваапрацоўшчык“ і актыўная ўдарніца часопісі „Бел. раб. і сял.“.

Работніцы даказалі, што яны могуць процаваць і на самых вышэйшых разрадах, Старшыня вытворчага сэктару машыннага цэху гаворыць: „вытворчыя камуны выключна з работніц (якіх налічваецца 11) працуюць добра, яны і ў часе прарыву добра мабілізавалі сябе і вышлі з добрымі вынікамі.

На апошнім пасяджэньні бюро калектыву стаяла пытаньне аб пераваліфікацыі работніц, бюро канстатавала пералом.

Загадчыкам цэхаў прапанавана ў 3-месячны тэрмін перабудаваць працу так, каб на кожным працэсе работы працавалі работніцы. Прапанавана вылучыць за тры месяцы 40 работніц на вышэйшую кваліфікацыю. Устанавіць, як правіла, што вылучаюцца выключна лепшыя ўдарніцы, якія выконваюць узятыя на сябе абавязкі. Кантраляваць штомесячна выкананьне гэтых дырэктыў. Такім чынам пры належнай увазе да пераваліфікацыі работніц з боку партыйнай і прафэсыянальнай арганізацый мы дабіліся поўнага пералому ў справе пераваліфікацыі работніц. **Асаёнак.**

ЗОК/1844

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ЦЕНТР. ГОСБИБЛИОТЕКА Т.С.С.Р.
Инв. № 15

БЕЛАРУСКАЯ

РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

№ 11 красавік 1931.

Ударніца-тэхнік.

На працягу бліжэйшых 10 год дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны ў тэхніка-эканамічных адносінах

(Што пастачавіў VI Усесаюзны зьезд Саветаў)

За час ад мінулых зьездаў саветаў адбыліся вялізарныя зьмены як унутры Савецкага Саюзу, так і ў міжнародных узаемаадносінах. Рабочая кляса Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, вядучы за сабою асноўныя масы сялянства і ўсіх працоўных, упарта змагалася за перамогу сацыялізму. У выніку гэтага мы маем магчымасьць адзначыць вялізарныя посьпехі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Пры агульным росьце народнай гаспадаркі Савецкага Саюзу шпаркімі тэмпамі ідзе рост сацыялістычнага сэктару. Барацьба за сацыялізм, разгортваньне сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце адбываецца на падставе няўхільнага змаганьня за перамогу генэральнай лініі партыі, супроць ухілаў ад яе, супроць правага ўхілу, як найбольш небясьпечнага на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва, супроць „левых" загібаў і прымірэнчых да іх адносін.

За мінулыя два гады пляны сацыялістычнага будаўніцтва, вызначаныя па пяцігодцы, па ўсіх асноўных галінах нашай гаспадаркі значна перавыкананы. Так, выкананьне за гэтыя гады дзяржбюджэту вызначаецца ў разьмеры 124 проц., а па капітальных укладаньнях пляны выкананы на 109 проц., па валавой прадукцыі прамысловасьці—на 104 проц., па пасеўнай плошчы—103 проц., таварная прадукцыя збожжавых прадуктаў складае 121 проц. супроць плянаў. Гэтыя лічбы выразьней за ўсё паказваюць, што тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, якія вызначаны Камуністычнай партыяй і Савецкім урадам, зьяўляюцца зусім рэальнымі, бо на падставе шырокага разгортваньня ініцыятывы рабочае клясы пляны для рэалізацыі гэтых тэмпаў ня толькі выконваюцца, але і перавыконваюцца.

Пляны па разгортваньні прамысловасьці значна перавыкананы, асабліва значнае выкананьне наглядаецца па цяжкай прамысловасьці. Агуловая прадукцыя цяжкай прамысловасьці за мінулыя два гады дае выкананьне на 193 проц. супроць вызначаных плянаў. Па машынабудаўніцтве пляны перавыкананы ў $2^1/_2$ разы. Дзякуючы гэтаму ўдзельная вага валавой прадукцыі прамысловасьці з кожным годам павялічваецца і за два гады ўзьнялася з 57 да 67 проц., што складае $^2/_3$ агульнай прадукцыі народнай гаспадаркі.

З гэтага мы павінны зрабіць важнейшыя вывады. Задача індустрыялізацыі краіны Савецкага Саюзу ня толькі выконваецца, але і перавыконваецца. Пры агульным перавыкананьні плянаў прамысловага будаўніцтва, асабліва значны рост мае цяжкая, вядучая прамысловасьць. У выніку гэтага прамысловасьць павялічвае сваю ўдзельную вагу ва ўсёй народнай гаспадарцы і тым самым замацоўваецца, як вядучая галіна нашай народнай гаспадаркі.

Разгортваньне і выкананьне плянаў сацыялістычнага будаўніцтва Савецкага Саюзу зьяўляецца вялізарным вагаром у справе **глыбокага вырашэньня нацыянальнага пытаньня.** Асабліва шпаркімі тэмпамі растуць і разьвіваюцца, узьнімаючыся да новага сацыялістычнага жыцьця, былыя прыгнечаныя народы нашай краіны, арганізаваўшыся ў савецкія сацыялістычныя рэспублікі. Так **рашуча праводзячы ў жыцьцё ленінскую нацыянальную палітыку і разгортваючы барацьбу супроць ухілаў ад гэтай ленінскай лініі—супроць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму, як найбольш небясьпечнага, супроць мясцовых шавінізмаў, — наша партыя і ўрад дабіваюцца яшчэ большага інтэрнацыянальнага згуртаваньня працоўных усіх нацыянальнасьцяй Савецкага Саюзу для пасьпяховай барацьбы за сацыялізм.**

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва Савецкага Саюзу ўжо адбіваюцца на **паляпшэньні дабрабыту**

рабочае клясы і ўсіх працоўных. Разам з гаспадарчымі зьменамі ўнутры Савецкага Саюзу, якія характарызуюцца тым, што пры агульным росьце народнай гаспадаркі шпаркімі тэмпамі ўзмацняецца яе сацыялістычны сэктар, адбываюцца таксама сацыяльныя зьмены ўнутры Савецкага Саюзу. **Ідзе шпаркі рост колькасьці рабочае клясы. У Савецкім Саюзе ліквідавана беспрацоўе,** паляпшаецца дабрабыт і культурнасьць рабочых, узьнімаецца палітычная актыўнасьць рабочае клясы, узмацняецца кіруючая роля рабочых у барацьбе за сацыялізм.

Посьпехі калектывізацыі паказваюць, што мільёны сялянскіх гаспадарак ужо вырашылі пытаньне

Лепшая ўдарніца інструмантальнага цэху заводу „Энэргія" тав. Адамовіч.

аб тым, што яны ідуць разам з рабочай клясай, і калгасьнікамі, якія зьяўляюцца моцнай апорай партыі і савецкай улады на вёсцы, за колгасы, супроць кулака.

Разам з ростам і ўзмацненьнем сацыялістычнай базы Савецкай улады адбываецца **працэс паступовага выкарчоўваньня рэштак капіталізму ў горадзе і ў вёсцы.** Клясавы вораг дыктатуры пралетарыяту паступова траціць сваю сацыяльную базу. Вось чаму, у тэй барацьбе, якую вядуць клясавыя ворагі супроць дыктатуры пралетарыяту і сацыялістычнага будаўніцтва, яны свае асноўныя надзеі ўскладаюць на імпэрыялістычныя сілы, на інтэрвэнцыю з боку імпэрыялістаў. Гэта мы выразна бачылі на прыкладзе працэсу „прампартыі", працэсу меншавікоў. Гэта мы таксама выразна бачым з тых паказаньняў, што даюць беларускія нацыянал-дэмакраты, арыштаваныя за контр-рэвалюцыйную работу.

На падставе буйнейшых посьпехаў індустрыялізацыі і калектывізацыі савецкай краіны, сацыялістычны сэктар заняў пануючае становішча ва ўсёй народнай гаспадарцы. Дзякуючы гэтаму краіна Саветаў уступіла ўжо ў пэрыяд непасрэднага будаўніцтва сацыялізму, у апошні пэрыяд НЭП'у. „Наперакор жаданьням і прадраканьням ворагаў, ня гледзячы на шалёную барацьбу з боку капіталістычных элемэнтаў, наперакор дробна-буржуазнаму нявер'ю і хістаньням апартуністаў, пытаньне аб перамозе сацыялізму ў нашай краіне вырашана і перамога сацыялізму ў Савецкім Саюзе цалкам забясьпечана".

Гэтыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва Савецкага Саюзу адбываюцца побач з **разгортваньнем і паглыбленьнем эканамічнага крызісу ў капіталістычных краінах.** Гэты эканамічны крызіс выклікае паступовае расхістваньне і рыхтуе канчатковую згубу для ўсёй капіталістычнай сыстэмы. Тыя супярэчнасьці, што пераживаюць капіталістычныя краіны, крах надзей нашых ворагаў на капіталістычнае перараджэньне Савецкага Саюзу значна ўзмацняюць варожую палітыку міжнароднага капіталу супроць Савецкай краіны.

Такім чынам, у выніку пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва мы маем **абвастрэньне ўзаемаадносін Савецкага Саюзу з акружаючымі яго варожымі капіталістычнымі дзяржавамі.** У апошні час гэта варожасьць адзначаецца разгортваньнем хлусьлівай антысавецкай кампаніі ў выглядзе крыжовага паходу, хлусьні аб савецкім дэмпінгу, выдумкі аб „прымусовай працы" ў Савецкім Саюзе. Разам з гэтым **наглядаецца імкненьне арганізаваць фінансава-эканамічную блёкаду супроць Савецкага Саюзу.** Усё гэта зьяўляецца паказальнікам таго, што капіталістычны сьвет шалёна рыхтуе ўзброеную інтэрвэнцыю супроць СССР.

Таму трэба яшчэ больш узмацніць нашу ўвагу справе абароны краіны. Савецкі Саюз рашуча праводзіў у жыцьцё палітыку міру, папярэджваючы магчымасьць новай вайны, і ўпарта абараняў інтарэсы Савецкага Саюзу ад прагавітых імпэрыялістычных акул. Разам з гэтым Савецкі Саюз, **узмацняючы баяздольнасьць Чырвонай арміі,** меў магчымасьць рашуча адбіць спробу імпэрыялістаў парушыць правы Савецкага Саюзу на Ўсходня-Кітайскай чыгункі. І надалей Савецкі ўрад будзе кіраваць імкненьнем абараніць мір, і надалей працоўныя СССР будуць абараняць інтарэсы Савецкага Саюзу. Такі сэнс мае пастанова VI ўсесаюзнага зьезду саветаў аб тым, каб скарачаць і спыніць імпорт з тых імпэрыялістычных краін, што замест сапраўднага ўзмацненьня гаспадарчых узаемаадносін з Савецкім Саюзам, праводзяць мерапрыемствы зрыву савецкага экспарту, прыкрываючыся хлусьлівымі байкамі аб прымусовай працы. Грозным папярэджаньнем для ўсіх капіталістаў павінна служыць таксама пастанова VI ўсесаюзнага зьезду саветаў аб тым, што ўзброены напад на Савецкі Саюз азначае ў сучасны момант галоўную небясьпеку для тых, хто адважыцца парушыць мір і напасьці на Савецкі Саюз.

Вялізарныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, рост міжнароднага значэньня Савецкага Саюзу далі магчымасьць VI ўсесаюзнаму зьезду саветаў вынесьці пастанову аб тым, **каб ужо на працягу бліжэйшых 10-ці год дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краіны ў тэхніка-эканамічных адносінах.** Гэта значыць, што працоўныя Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ня могуць задаволіцца тымі дасягненьнямі, што мае Савецкі Саюз, але ставяць перад сабой новыя, яшчэ больш складаныя задачы. Гэта значыць, што тэмпы барацьбы за сацыялізм ня толькі ня спыняюцца, але, наадварот, павінны яшчэ больш узмацняцца для пасьпяховага вырашэньня пастаўленых задач.

Згодна народна-гаспадарчаму пляну на 1931 год, агуловая прадукцыя гэтага году ў два разы павінна перавысіць тое, што атрымана было за мінулыя 4 гады. Па чыгуне, сталі, пракаце, баваўняна-папяровай прамысловасьці пяцігодка павінна быць выканана за чатыры гады; па цэмэнце за

3½ гады, па электрыфікацыі, каменным вугалі, торфе, цукры—за 3 гады; па нафце, медзі, агульным машынабудаўніцтве, трактарах, сельска-гаспадарчым, суднабудаўніцтве—пяцігодка выконваецца за 2½ гады. Як вядома, **па Азэрбайджанскай нафце пяцігодка ўжо выканана.** Гэтыя тэмпы патрабуюць вялізарнага напружаньня і разгортваньня ініцыятывы рабочае клясы, патрабуюць шырокага скарыстаньня сацыялістычных форм працы праз разгортваньне сацспаборніцтва, ударніцтва і г. д. Гэтыя задачы будуць выкананы толькі ў тым выпадку, калі ўсе працоўныя будуць прымаць меры да таго, каб запоўніць прарывы на паасобных вучастках работы, каб цалкам выканаць і перавыканаць вызначаныя пляны.

Асабліва важна зьвярнуць увагу пры разгортваньні прамысловага будаўніцтва на ўзьняцьце работы транспарту, які на даным этапе зьяўляецца вузкім месцам народнае гаспадаркі. Таксама вялізарная ўвага павінна аддавацца справе разгортваньня мэталёвай прамысловасьці і прамысловасьці па здабычы апалу. Задача індустрыялізацыя краіны зьяўляецца абавязкам ня толькі рабочых, але і бядняцка-серадняцкага сялянства і ўсіх калгасьнікаў. VI усесаюзны зьезд саветаў па гэтым пытаньні гаворыць наступным чынам:

„Зьезд падкрэсьлівае рашаючае азначэньне разьвіцьця цяжкай прамысловасьці, асабліва мэталюргіі, машыннага будаўніцтва, трактарабудаўніцтва, аўтабудаўніцтва, сельска-гаспадарчага машынабудаўніцтва і хэміі для далейшага ўздыму сельскай гаспадаркі калгасаў і саўгасаў.

Без магутнага разьвіцьця прамысловасьці, гаспадарцы бедняка і серадняка—селяніна пагражала-б руйнаваньне, загніваньне на ўзроўні мала прадукцыйнай, дробнай гаспадаркі і ўзмацненьне кулацкай кабалы".

У гэтым годзе павінна быць скончана пабудова фундаманту сацыялістычнай эканомікі нашай краіны. Вырашэньне гэтай задачы залежыць ад выкананьня задачы ўцягненьня ня менш 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы, што разам з выкананьнем іншых задач сацыялістычнага будаўніцтва забясьпечвае сканчэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Тыя вялізарныя задачы, што стаяць перад краінай Саветаў у сучасны момант, **патрабуюць рашучай перабудовы работы ўсіх партыйных, прафэсыянальных, савецкіх і іншых арганізацый** у адпаведнасьці з гэтымі задачамі. Скончаная нам кампанія па перавыбарах саветаў праходзіла пад кутом погляду перабудовы работы саветаў у адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду. Трэба дабівацца таго, каб саветы рашуча павярнуліся тварам да вытворчасьці, тварам да калектывізацыі, каб саветы сапраўды былі арганізатарамі мас у барацьбе за сацыялізм, у барацьбе за выкарчоўваньне рэштак капіталізму. **Гэта перабудова саветаў у значнай меры павінна ісьці па лініі ўцягненьня ў саветы жанчын-работніц, калгасьніц—ударніц.** У гэтым годзе мы дабіліся ў часе перавыбараў значнага ўзьняцьця ўдзелу жанчын гораду і вёскі ў перавыбарчай кампаніі. **Там, дзе была правільна пастаўлена работа, каля 80 проц. працоўных жанчын зьявіліся на выбары. Вельмі значна таксама ўзьнялася колькасьць жанчын у кіруючых органах саветаў. Аднак, на гэтым нельга спыніцца. Мы ўсе ведаем, што справа сацыялістычнага будаўніцтва будзе канчаткова забясьпечана толькі ў тым выпадку, калі працоўная жанчына разам з мужчынай сапраўды плячом к плячу будзе стаяць у радох барацьбітоў за сацыялізм.**

Вось чаму **трэба дабівацца, каб усе жанчыны, што выбраны ў саветы, замацаваліся на практычнай рабоце ў саветах, каб яны прымалі актыўны ўдзел у справе кіраваньня дзяржавай, у справе сацыялістычнага будаўніцтва. Замацаваўшы гэтыя кадры, мы павінны пашыраць сваю работу ў далейшым такім чынам, каб усё новыя і новыя пласты работніц, калгасьніц, бяднячак і серадняцак, у першую чаргу лепшых ударніц, высунуць на кіруючую работу, рыхтуючы іх праз грамадзкія арганізацыі, праз штодзеннае ўважлівае выхаваньне. Вельмі важна, каб пры вырашэньні пытаньня аб падрыхтоўцы кадраў належная ўвага аддавалася ўсімі** нашымі **арганізацыямі таксама і справе падрыхтоўкі кадраў з працоўных жанчын.** Вельмі важна таксама, каб пры вырашэньні пытаньня аб аўладаньні тэхнікай **узброіваць тэхнічнымі ведамі і працоўную жанчыну.** Гэта на шмат раз паскорыць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, на шмат раз паскорыць справу перамогі сацыялізму ў нашай краіне.

Партыя і ўрад далі цэлы рад важнейшых дырэктыў як па ўсіх пытаньнях сацыялістычнага будаўніцтва, так і па пытаньнях аб уцягненьні працоўнай жанчыны ў справу сацыялістычнага будаўніцтва. Трэба дабівацца таго, каб гэтыя дырэктывы праводзіліся ў жыцьцё, трэба паставіць рашуча пытаньне аб **праверцы таго, як ідзе выкананьне гэтых дырэктыў.** Як вядома, праверка выкананьня—гэта ёсьць адзін з важнейшых момантаў, што забясьпечваюць пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва. Вось з гэтае прычыны, арганізоўваючы праверку выкананьня па ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, трэба таксама наладзіць праверку выкананьня і тых дырэктыў партыі і ўраду, што датычаць задачы ўцягненьня ў актыўнае сацыялістычнае будаўніцтва працоўных жанчын.

Каб выканаць тыя задачы, што перад намі стаяць, мы павінны дабівацца таго, каб кожнае наша мерапрыемства было даведзена да канца, каб паасобныя прарывы на паасобных вучастках нашай работы сваячасова зьнішчаліся. Вось з гэтае прычыны кожны з нас павінен зьвярнуць увагу на якасьць сваёй работы. **Якасьць работы на фабрыцы і заводзе ёсьць адна з важнейшых праблем сацыялістычнага будаўніцтва. Якасьць работы ў калгасах і саўгасах служыць аднэй з важнейшых падстаў узмацненьня і разгортваньня сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.**

З гэтае прычыны мы павінны напружыць усе сілы, каб задачы гэтага году былі сваячасова і добрасумленна выкананы.

Наша краіна ўступіла ў пэрыяд сацыялізму, яна знаходзіцца ў апошнім пэрыядзе НЭП'у. Наша задача заключаецца ў тым, каб скарыстаць усе магчымасьці для пасьпяховага разгортваньня сацыялістычнага будаўніўтва, для канчатковай перамогі сацыялізму. Мы перамагаем у барацьбе за сацыялізм пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, вядучы барацьбу за генэральную лінію партыі.

Рашуча змагаючыся супроць усялякіх ухілаў ад генэральнай лініі партыі, рабочая кляса, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, апіраючыся на калгасьнікаў і беднату у саюзе з серадняками, вядучы за сабою ўсіх працоўных, пераможа ў барацьбе за сацыялізм.

А. Чарвякоў.

---

*) Аб пастановах зьезду па калгасным будаўніцтве надрукавана ў № 10 нашай часопісі.

Пераводам калгасаў на зьдзельшчыну ўзьнімем прадукцыйнасьць працы

25-га сакавіка скончыў сваю работу трэці ўсебеларускі зьезд калгасаў. Звыш 400 дэлегатаў—калгасьнікаў падвадзілі вынікі калгаснага будаўніцтва па БССР за апошнія два гады і вызначылі далейшыя задачы па сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі.

Старшыня Белкалгасцэнтру тав. Міцькоў гутарыць з калгасьніцамі.

Звыш 5 тысяч 600 калгасаў, у якіх аб'яднана вялікая армія калгасьнікаў у ліку звыш 165 тысяч чалавек — асноўнае дасягненьне двухгадовай работы пад непасрэдным кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

Асноўныя бядняцка-серадняцкія масы сялянства глыбока пераканаліся ў тых вялікіх перавагах, якія мае буйная калектыўная гаспадарка перад дробнай аднаасобнай сялянскай гаспадаркай. Мінулы двухгадовы пэрыяд быў пэрыядам масавага ўступленьня беднаты і сераднякоў у калгасы. Наперакор кулакам і ўсім шкоднікам, наша Савецкая краіна пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі ідзе наперад шпаркімі крокамі па шляху суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы на гэтай аснове.

На нашых вачох мяняецца ўвесь твар зямлі. Зусім іншы размах у працы, іншыя ўраджаі, якія выразна паказваюць, што пераход ад дробнай аднаасобнай гаспадаркі да буйнай калектыўнай ёсьць адзіна правільны шлях для ўсяго бядняцка-серадняцкага сялянства.

У трэцім рашаючым годзе пяцігодкі партыя і савецкая ўлада паставілі перад калгасамі вялікія задачы, пасьпяховае выкананьне гэтых задач магчыма толькі пры ўзьняцьці прадукцыйнасьці працы ў калгасах.

Адным з недахопаў, які перашкаджаў узьняцьцю прадукцыйнасьці працы ў калгасах, зьяўляецца разьмеркаваньне прыбыткаў калгасу не па колькасьці і якасьці працы, а па душах. Пры такім разьмеркаваньні ўраджаю, якое праводзіцца па душах, некаторыя калгасьнікі могуць увільваць ад работы і, прапрацаваўшы мала, атрымаць такую-жа частку ўраджаю, як і тыя, што працавалі па-ўдарнаму. У радзе калгасаў наглядалася, што некаторыя працаздольныя жанчыны ня выходзілі на работу, быццам-бы з-за дзіцяці, у той час як пры калгасе існуюць ясьлі. Яны лічылі, што ўсё роўна і не працуючы атрымаюць сваю частку.

Зразумела, што пры такім разьмеркаваньні прыбыткаў адсутнічае матар'яльная зацікаўленасьць з боку калгасьнікаў. Вось чаму шкодна разьмеркаваньне па душах, бо яно затрымлівае ўздым вытворчасьці калгасаў і таму грае на руку кулаку. Для таго, каб правільна разьмеркаваць ураджай, неабходна ў першую чаргу правільна арганізаваць працу ў калгасах. Усесаюзны зьезд саветаў паставіў задачу пераходу працы ў калгасах на зьдзельшчыну.

„Вопыт паказвае, што адзіна правільным спосабам арганізацыі працы ў калгасах зьяўляецца зьдзельшчына, таму што яна дазваляе зацікавіць кожнага калгасьніка ў рэзультатах працы".

(З дакладу тав. Якаўлева на VI зьезьдзе саветаў).

Сутнасьць зьдзельшчыны заключаецца ў тым, што для кожнай працы ўстаноўлена норма выпрацоўкі і праца калгасьніка вымяраецца ў працаднёх: напрыклад, калі норма ўзворваньня ўстаноўлена адзін гект. у дзень, а калгасьнік заараў паўтары гект., дык яму залічваецца паўтары працадні, ня гледзячы на тое, што ён працаваў толькі адзін дзень.

Разьмеркаваньне ўраджаю і іншых прыбыткаў у калгасах павінна праводзіцца толькі па колькасьці і якасьці працы калгасьнікаў: хто больш і лепш выпрацоўвае, той больш і атрымлівае. Толькі гэтакім шляхам магчыма ўзьняць прадукцыйнасьць працы ўсіх калгасьнікаў і тым самым палепшыць гаспадарчае становішча калгасаў, а таксама і матар'яльнае становішча калгасьнікаў.

Адсюль вынік — зьдзельшчына павінна быць уведзена ва ўсіх без выключэньня калгасах.

Калгасьніцы асабліва зацікаўлены ў пераводзе працы ў калгасах на зьдзельшчыну, бо раней у шмат якіх калгасах жанчыны, якія выконвалі аднолькавую работу з мужчынамі, атрымлівалі ніжэйшую аплату. Пры зьдзельшчыне яны будуць атрымліваць за роўную працу і роўны прыбытак. Так у камуне імя БВО, дзе амаль уся праца пераведзена ня зьдзельшчыну, камунаркі-даглядчыцы жывёлы выпрацоўваюць значна больш, чым камунары.

СНК БССР у сваёй пастанове абавязаў усе савецкія арганізацыі забясьпечыць перавод на зьдзельшчыну да 15-га красавіка кожнага калгасу і саўгасу. Калгасьніцы павінны актыўна дапамагаць пераводу калгасаў на зьдзельшчыну.

Ажыцьцяўленьне зьдзельшчыны ў калгасах выклікае хвалю новага калгаснага прыліву, бо кожны бядняк і серадняк бачыць, што добра арганізаваная праца калгасьнікаў на аснове норм выпрацоўкі, з улікам у працаднёх, зможа сапраўды даць вялізарны ўздым калгаснай гаспадаркі.

Зьдзельшчына ў калгасах павінна зрабіцца магутным вагаром для сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасах, зброяй барацьбы супроць кулацтва і яго памочнікаў правых і „левых" апартуністаў.

К—к.

Скарыстаем новыя ільготы для далейшага замацаваньня і пашырэньня калгаснага руху

Новы закон пра сельгаспадатак на 1931 год.

Новы закон пра сельгаспадатак цалкам адбівае той рашучы пералом, які адбыўся ў эканоміцы савецкай краіны наогул і ў эканоміцы сельскай гаспадаркі ў прыватнасьці; ён прадугледжвае найшырэйшыя формы дапамогі і садзейнасьці з боку савецкай дзяржавы вёсцы, якая калектывізуецца.

Сёлета па БССР павінна быць калектывізавана ня менш 45 проц. сялянскіх гасадарак (па СССР—50 проц.).

Зусім зразумела, што закон пра сельгаспадатак цалкам прыстасаваны да вырашэньня важнейшых задач сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, задачы замацаваньня існуючых калгасаў і арганізацыя моцнага прыліву новых мільёнаў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы.

Новы закон пра сельгаспадатак улічвае буйныя зьмены, якія адбыліся ў клясавым і гаспадарчым жыцьці вёскі, і спрыяе вырашэньню чарговых задач партыі і ўраду. Галоўнай асаблівасьцю гэтага закону зьяўляецца новы парадак абкладаньня калгасаў. Сёлета абкладаемы даход у калгасах вызначаецца не па нормах, як летась, а па іх справаздачнасьці. Гэта ставіць перад калгасамі задачу належным чынам упарадкаваць сваю справаздачнасьць, бо, як сказаў наркамзем СССР тав. Якаўлеў: „Дзе няма уліку, там няма і буйнай гаспадаркі. Дзе няма ўліку—няма калгасу як організаванай гаспадаркі". Вызначаны па справаздачнасьці даход абкладаецца, як і летась, прапарцыянальна; з кожнага рубля яго бярэцца 3 капейкі ў камунах і арцелях і 4 капейкі ў таварыствах па супольнай апрацоўцы зямлі.

Шляхам дачы буйнейшых ільгот калгасам, новы закон гэтым садзейнічае масаваму прыліву ў калгасы, спрыяе найбольшаму аграмаджаньню калектыўнай гаспадаркі і найбольшаму росту даходнасьці і таварнасьці калгасу. **Уся жывёла ў калгасах вызваляецца ад падатку; таксама вызваляюцца ад падатку прырост пасеўнай плошчы і зямля, якая ў першы раз скарыстоўваецца пад гарод;** даходу з маемасьці, якая ўнесена ў калгас беднатой, абкладаецца толькі адна чвэртка яго. **Лён і каноплі абкладаюцца** не па сапраўдным даходзе, а **па даходзе паменшаным да $1^1/_2$ гектара збожжавых культур. Калгас атрымлівае буйныя ільготы па аграмаджаных садох, гародах, сеяных травах і кораньплодах, а таксама за вайскоўцаў.** Апрача гэтага **маламоцныя калгасы цалкам вызваляюцца ад падатку. Калгасы, якія выканалі свае вытворчыя заданьні па пасеве, апрацоўцы і ўборцы, артымліваюць 10 проц. скідкі з падатку. Неаграмаджаная прадукцыйная жывёла калгасьнікаў вызваляецца ад падатку. Таксама вызваляюцца ад падатку тыя калгасьнікі па іх неаграмаджанай маемасьці, якія летась да ўступленьня ў колгас былі вызвалены па маламоцнасьці.**

Закон пра сельгаспадатак улічвае інтарэсы ня толькі калгаснага сялянства, але і тых бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі, якія, яшчэ не зразумеўшы перавагу калектыўнай гаспадаркі, пакуль што ня ўступілі ў калгасы. Для гэтых груп таксама ўстаноўлены істотныя ільготы, якія цалкам адказваюць задачам пашырэньня гэтымі гаспадаркамі сваіх пасеваў, разьвіцьця імі жывёлагадоўлі і тэхнічных культур. **У бядняцка-серадняцкіх гаспадарках прырост супроць леташняга прадукцыйнае жывёлы зусім вызваляецца ад падатку, таксама не абкладаюцца сьвіньні і прырост пасеўнай плошчы. Пасевы ільну і канапель абкладаюцца па нормах паменшаных напалову. За вайскоўцаў серадняцкія гаспадаркі атрымліваюць скідку з падатку.**

Калгасьніцы вывучаюць жнявярку.

Нарэшце, па 13 раёнах прамысловага масларобства даход з кароў і бугаёў у гаспадарках, што закантрактавалі прадукцыю жывёлагадоўлі, абкладаецца па нормах, паменшаных напалову.

У дачыненьні да кулакоў, у адносінах іх закон, як і іншыя мерапрыемствы пралетарскай дзяржавы, зьяўляецца вострай зброяй за поўную ліквідацыю кулакоў на базе суцэльнай калектывізацыі. **Ні адзін кулак не павінен выкруціцца ад індывідуальнага абкладаньня.** Разам з гэтым **ні адна серадняцкая гаспадарка не павінна быць закранута індывідуальным абкладаньнем.** З мэтай стварэньня спрыяючых умоў для пасьпяховага правядзеньня кантрактацыі, з аднаго боку, і правільнага разьмеркаваньня цяжару падатку паміж асобнымі гаспадаркамі—з другога, новы закон прадугледзеў, што даходы ад продажу сельска-гаспадарчых прадуктаў уласнай гаспадаркі на прыватным рынку па цэнах, перавышаючых цэны дзяржаўных і каапэрацыйных загатоўчых арганізацый, абкладаюцца сельгаспадаткам. Аднак, **закон забараняе абкладаць такія даходы ад продажу тых прадуктаў, па якіх гаспадарка выканала цьвёрдыя заданьні і кантрактацыйныя дагавары.** Гэта будзе спрыяць выкананьню нашых плянавых загатовак і іх кантрактацыйных дагавароў. Бедната будзе цалкам або часткова вызвалена ад падатку сельскімі і раённымі падатковымі камісіямі.

Установленыя законам буйныя ільготы для калгасаў і для некалектывізаваных яшчэ бядняцка-серадняцкіх гаспадарак павінны быць шырока растлумачаны ўсяму працоўнаму сялянству: калгасьніку і аднаасобніку яшчэ да выхаду ў поле.

У ажыццяўленьні гэтага закону працоўныя жанчыны павінны прымаць актыўны ўдзел. Яны павінны рашуча змагацца за выразнае і клясавае правядзеньне закону. Актывісткі павінны дапамагчы сельскім падатковым камісіям пры падліку аб'ектаў абкладаньня. Усім вядома, што заможная частка захоўвае крыніцы даходу ад абкладаньня, асабліва зямлю і неземляробчыя заработкі. Тут якраз для актывісткі шырокае поле дзеяньня. Яна павінна паведамляць сельскім падатковым камісіям аб такіх зьявішчах. Працоўныя жанчыны павінны таксама прыняць самы актыўны ўдзел у складаньні сьпісу беднаты на вызваленьне ад падатку. Гэта дасьць магчымасьць вызваліць сапраўдную беднату і зьнішчыць меўшыя месцы летась выпадкі, калі пад бедняка падмазваецца заможнік і нават кулак.

Надзвычай **вялікая задача ўскладаецца на дэлегатак-актывістак у справе дапамогі ў выяўленьні кулакоў для індывідуальнага абкладаньня.** Каму лепш вядомы эксплёататарскія ўчынкі таго ці іншага кулака, калі не бяднячцы, якая сама на сваей сьпіне пераносіла гэтую эксплёатацыю. Пры гэтым трэба весьці рашучую барацьбу супроць залічэньня ў кулакі працоўных сялян-сераднякоў.

М. Тайц.

З ўсіх куткоў Беларусі

1-шы зьлёт жонак камандзіраў

Зьлёт жонак камандзіраў паказаў, што яны хочуць прыняць актыўны ўдзел у грамадзкім жыцьці.

У зьлёце прымала ўдзел каля 200 жанчын. Адна за другой яны выступалі і адзначылі ўсе недахопы. Адзначылі, што шмат сярод жонак камандзіраў палітычна няпісьменных. Ёсьць выпадкі шавінізму, антысэмітызму.

Некаторыя жонкі цэлыя дні праводзяць у каапэратыве, чакаючы калі вылажаць тавар на прылавак. Дый тыя жонкі, якія не працуюць, запаўняюць час уборамі. Усё гэта таму, што **не вялося ніякай работы сярод жонак камандзіраў.** У гэтым вінаваты ваенная партыйная арганізацыя і гарком.

У далейшым неабходна жонак камандзіраў больш уцягваць у грамадзкую працу. У нас сярод жанчын ёсьць і няпісьменныя. Агульную і палітычную няпісьменнасьць неабходна ліквідаваць неадкладна. Палкавая партыйная арганізацыя павінна заняцца гэтым пытаньнем. ДКА павінен паклапаціцца аб тым, каб падрыхтаваць з жонак камандзіраў кадры для сацыялістычнага будаўніцтва.

Чубунова,

Купрыянава.

Менск.

Калгасьніцу-ударніцу выбралі ў ЦВК

10-ты ўсебеларускі зьезд саветаў выбраў членам ЦВК БССР дэлегатку ад Бягомльскага раёну, батрачку-ўдарніцу з калгасу „Усход", Бярэзінскага сельсавету, **Хацкевіч** Алесю.

Хацкевіч Алеся — сапраўдная ўдарніца калгасу „Усход". Яна першая ўступіла ў гэты калгас і ў першую чаргу пачала вербаваць жанчын, якія гурбамі пачалі ўступаць у калгас.

Хацкевіч Алеся мае 22 гады, яна малапісьменная, мае малое дзіця, але паўсюды спраўляецца. Яна зьяўляецца нязьменным членам праўленьня калгасу „Усход" — буйнейшага і самага ўзорнага ў раёне.

Пасьля абраньня яе членам ураду яна зайшла ў рэдакцыю сваёй газэты „Калгасны змагар" і, з радасьцю паказваючы значок члена ЦВК, заявіла: „цяпер мне трэба падвучыцца, бо работы перада мною—непачаты край. Патрэбна падзаняцца ліквідацыяй няпісьменнасьці, а таксама практыкавацца палітычна". **В. Ш.**

Усе будзем укладчыкамі

Дэлегаткі вытворчага дэлегацкага сходу пастанавілі, каб кожная была ўкладчыцай ашчадкасы. Тут-жа дэлегаткі абавязаліся ўкласьці, хто па 10—30 руб., а хто 50—100 руб. Дэлегаткі таксама пастанавілі вербаваць укладчыкаў сярод насельніцтва. **П. Х.**

Старыя-Дарогі.

Ачысьціць сельскі савет ад апартуністых.

У вёсцы Карпілаўцы, Глускага раёну, арганізаваўся калгас, у склад якога ўвайшло 12 гаспадарак. **Трэба адзначыць, што члены сельсавету ўпарта ня хочуць уступіць у калгас.**

У гэтай-жа вёсцы **цьвёрдыя заданьні, даведзеныя да кулакоў, ня выконваюцца.** Трэба прыняць рашучыя меры да таго, каб цьвёрдыя заданьні былі выкананы. **Неабходна ўдарыць па апартуністычнаму кіраўніцтву сельсаветам.**

Ведаючы.

За ганеньне на селькорку атрымалі па заслугах

У калгасе „Будаўнік" Каменскага сельсавету, Вузьдзенскага раёну, мела месца ганеньне на селькорку-актывістку Ганну Мрочак. Асабліва актыўны ўдзел у цкаваньні прымаў намесьнік старшыні калгасу Язэп Байкоўскі і Рудакоўскі Ігнат.

У гэтым калгасе таксама квітнеў антысэмітызм. Так, былая калгасьніца Рудамінская, жонка варшаўскага чыноўніка, вяла агітацыю супроць працоўных яўрэяў.

Але ўсе варожыя элемэнты былі пакараны выязной сэсіяй Вузьдзенскага нарсуда. Байкоўскі быў прысуджан на 2 гады пазбаўленьня волі. Рудакоўскі Ігнат—на 8 месяцаў прымусовай працы, антысэмітка Рудамінская—на 1½ гады пазбаўленьня волі.

Вера Трус.

Тысячамі новых ударніц сустрэнем другую бальшавіцкую

Баярскі сельсавет калектывізаваны на 65 проц. Падрыхтоўка да сяўбы закончана

У дні дэкады сталінскага заклiку ў калгасы работа па калектывізацыі і падрыхтоўка да веснавой сяўбы ў Баярскім сельсавеце, Полацкага раёну, значна палепшылася. У сучасны момант падрыхтоўка да сяўбы ў колгасах і ў аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках поўнасьцю закончана.

У часе падрыхтоўкі арганізаваны два новыя колгасы, у якія ўступіла 39 гаспадарак. У старыя калгасы ўступіла 25 гаспадарак.

Па сельсавету арганізаваны ініцыятыўныя групы беднякоў і сераднякоў па арганізацыі калгасаў. Асабліва актыўны ўдзел у гэтых групах прымаюць дэлегаткі.

Яроменка.

Абвясьцілі сябе ўдарніцамі па правядзеньні другой бальшавіцкай вясны

Усе дэлегаткі камуны „Чырвоны аргылерыст“, Махіраўскага сельсавету, Полацкага раёну, падпісаліся на часопісь „Беларуская работніца і сялянка“. Дэлегаткі вылучылі ўпаўнаважаных па распаўсюджаньні часопісі.

Зараз усе дэлегаткі ў сувязі са Сталінскім заклікам уцягваюць у калгасы аднаасобнікаў. Восем дэлегатак уступілі ў рады партыі і комсамолу.

Усе дэлегаткі камуны „Чырвоны артылерыст“ абвясьцілі сябе ўдарніцамі па правядзеньні другой бальшавіцкай вясны.

Шэф Янка.

Дэлегаткі вярбуюць у калгасы.

Дэлегаткі калгасу „Страх ворагам“, Выдрэйскага сельсавету, Высачанскага раёну, **разьбіліся на 7 брыгад вярбовачных груп, якія будуць вербаваць аднаасобніц—бяднячак і сераднячак у калгасы.**

Брыгады ўжо прыступілі да работы. **Трэба ўсім дэлегацкім сходампасьледаваць іх прыкладу.**

В. Жураўлёва.



Трактарыстка саўгасу „Гігант“ за рамонтам трактара.

10 калгасьніц падалі заявы ў партыю

На зьлёце калгасьніц Копыскага раёну **10 калгасьніц падалі заявы ў партыю, 1—у ЛКСМБ.**

У адказ на дзейнасьць шкоднікаў **зьлёт сабраў 138 руб. 48 кап., на якія купіў акцыі Трактарацэнтру.** Усе ўдзельніцы зьлёту падпісаліся на газэту „Бязбожнік“.

С. Замасьціновіч.

Несваячасовая дастаўка вугалю зрывае рамонт інвэнтару

У часе правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі ў раёне Цішаўскага сельсавету, які складаецца з 8-мі населеных пунктаў, **арганізаваліся 4 новыя калгасы.**

Насеньне ачышчана на 95 проц., **сельска-гаспадарчы інвэнтар яшчэ ад гэтага часу, асабліва па індывідуальным сэктары, цалкам не адрамантаваны з-за несваячасовай дастаўкі вугалю.**

У саўгасе фэрма №2 да гэтага часу адміністрацыя не заключыла калдагавору з рабочымі.

Дэлегатка.

Рэдакцыя чакае тэрміновага адказу Цішаўскага сельсавету, што зроблена па зьнішчэньні паказаных з допісу недахопаў.

Яшчэ толькі думаюць праверыць

Зараз па калгасах БССР Белкаапсаюзам адкрыта 25 пастаянных ясьляй, у саўгасах—3 ясьлі і 5 дзіцячых садоў у камунах і саўгасах. Ужо год працуюць 2 перасоўваючых і 2 стацыянарных ясьляй, якія выключна абслугоўваюць калгасы і саўгасы.

У гэтым годзе да веснавой сяўбы Белкаапсаюз адкрывае ў калгасах 70 ясьляй, а ў саўгасах—15. Дзіцячых садоў будзе адкрыта ў калгасах 10 і ў саўгасах—6.

На летні сэзон будзе адкрыта 67 ясьляй у каўгасах і саўгасах, з гэтага ліку 10 ясьляй на торфараспрацоўках, таксама будзе адкрыта 39 пляцовак па калгасах і саўгасах.

Цяпер у калгасах ёсьць 173 сталоўкі, а да пасеўнай кампаніі намечана адкрыць 500 сталовак і 1.000 перавозачных кухань. Па саўгасах налічваецца 124 сталоўкі, да сяўбы будзе адкрыта яшчэ 66, перавозачных кухань будзе 63. У менскіх прыгарадных саўгасах і калгасах будзе адкрыта 29 сталовак.

Для таго, каб адкрыць усе сталоўкі і перавозачныя кухні ў тэрмін, патрэбна шмат інвэнтару, а гэтага не хапае. Таму яшчэ невядома, ці будуць усе сталоўкі адкрыты да сяўбы.

Веснавая сяўба ўжо не за гарамі, а ў Белкаапсаюзе яшчэ толькі думаюць праверыць, як выконваюць дырэктывы наконт падрыхтоўкі кадраў для бытавых устаноў.

Брыгада часопісі „Беларуская работніца і сялянка“

Арцюшкова, Несьцерава.

Рыхтуем кадры трактарыстаў

Калгас „Страх ворагам“ заключыў дагавор з Лясьнянскай МТС па правядзеньні веснавой сяўбы і ўборкі.

Калгас падрыхтоўвае сваіх трактарыстаў на кароткатэрміновых курсах, якія працуюць у калгасе. На гэтых курсах вучацца таксама дзяўчаты, якія старанна вывучаюць трактар.

Наўменка.

Усё новыя масы працоўных жанчын ў капіталістычных краінах уцягваюцца ў рэвалюцыйную барацьбу

Ня гледзячы на лютыя прасьледваньні і ганеньні, забарону дэманстрацый, сотні тысяч рэвалюцыйных работніц ва ўсіх куткох зямлі адгукнуліся на заклік Камуністычнай партыі і ў міжнародны жаночы камуністычны дзень дэманстравалі сваё цьвёрдае імкненьне рашуча змагацца з капіталістычным ладам, у якім дзесяткі мільёнаў рабочых і работніц б'юцца ў клешчах страшэннага беспрацоўя, беспрасьветнай нэндзы, голаду і калечы, дзе кожны дзень тысячы беспрацоўных, даведзеныя да роспачы, канчаюць самагубствам.

У гэты дзень рэвалюцыйныя работніцы на шматлікіх мітынгах і сходах давалі прысягу цаной свайго жыцьця абараняць Савецкі Саюз — краіну, у якой будуецца сацыялізм, адзіную бацькаўшчыну ўсіх прыгнечаных ад усіх злачынных авантур буржуазных урадаў, якія ліхаманкава падрыхтоўваюць вайну супроць СССР.

Так, з Чэха-Славакіі пішуць: „На грандыёзным мітынгу, які быў склікан у Празе, выступалі дэлегаткі з Заходняй Украіны і Вэнгрыі. Прысутныя на мітынгу далі прысягу весьці рашучую барацьбу за Савецкую Чэха-Славакію. Калі сход скончыўся і ўсе, стоячы, сьпявалі „Інтэрнацыянал", у залю ўварваліся паліцэйскія з крыкамі: „Цяпер мы лепш узброены, чым 25-га лютага", пачалі бязьлітасна зьбіваць прысутных жанчын. Шмат жанчын было арыштавана і адведзена ў паліцэйскія вучасткі".

У Бэрліне 8-га сакавіка, ня гледзячы на забарону з боку паліцыі, адбыліся шматлікія дэманстрацыі. На мітынгу прысутнічала звыш 3-х тысяч жанчын. Выступленьні японскай і баўгарскай работніц былі з захапленьнем спатканы ўсімі прысутнымі. 50 жанчын на гэтым-жа мітынгу ўступілі ў рады Камуністычнай партыі і ў саюз супроць фашызму.

У гэты час у Бэрліне адбыўся антыфашыцкі зьезд, на якім прысутнічала 536 дэлегатак. У Руры ў сувязі з 8-м сакавіка былі скліканы 10 раённых канфэрэнцый працоўных жанчын. На гэтых канфэрэнцыях быў створан баявы фронт жонак рабочых — камуністак, беспартыйных і спачуваючых нам сяброў з сацыял-дэмакратычных і каталіцкіх арганізацый. У Гельзэнкірхэне была арганізавана дэманстрацыя, у якой прымала ўдзел звыш 800 жанчын. Таксама ў Эсэне з вялікім уздымам быў праведзен мітынг. У Лейпцыгу сход, на якім прысутнічала звыш 1.000 жанчын, ператварыўся ў дэманстрацыю пратэсту супроць сацыял-дэмакратычнай паліцыі, „левага кіраўніка" сацыял-дэмакратычнай партыі Флейснэра, які расстраляў 5 рабочых і сярод іх адно дзіця.

У Мюнхэне 7-га сакавіка на цэнтральным рынку жонкі рабочых арганізавалі дэманстрацыю пад лёзунгам: „Прэч урад голаду! Прэч ганебны параграф 218!" Прысутныя шматлікія беспрацоўныя выказалі сваё спачуваньне.

І жанчыны ўзяліся горача за справу—гаварылі яны—значыцца, капіталістычная сыстэма трашчыць па ўсіх швах.

Паліцыя напала надэманстрантак, гвалтоўна іх расьсеяла і зрабіла 5 арыштаў. Прысутныя крычалі ўсьлед: „Пасаромеліся б, удвох вядуць адну работніцу, глеба выплывае ў вас з-пад ног і таму вы так зьверскі навальваецеся на жанчын".

Міжнародны жаночы камуністычны дзень у гэтым годзе ў Нямеччыне быў адсьвяткован у цясьнейшай змычцы працоўных гораду і вёскі. Так, ва Ўсходняй Прусіі былі скліканы дзьве канфэрэнцыі батрачак і бяднячак. Ва ўсёй Памэраніі ў вясковых мясцовасьцях былі арганізаваны мітынгі і сходы супроць фашызму і ўраду голаду.

Ва Францыі, у Парыжы 8-га сакавіка адбыўся вялікі мітынг. Прамоўцы ў сваіх выступленьнях ярка малявалі катаржныя ўмовы працы на капіталістычных прадпрыемствах. У рэзалюцыі, якая была прынята на мітынгу, гаворыцца: „работніцы абавязваюцца ўзмацніць барацьбу з капіталістамі, якія імкнуцца ўсе труднасьці крызісу пераваліць на плечы працоўных, выкрываць дэмагогію рэфарміцкіх і сацыял-фашыцкіх правадыроў, якія зьяўляюцца вернымі служкамі капіталістаў".

„Прысутныя на сходзе, прысьвечаным 8-га сакавіка,—гаворыць рэзалюцыя,—пратэстуюць супроць злачыннай дзейнасьці меншавікоў, якія ў саюзе з II Інтэрнацыяналам і кіраўнікамі буржуазных урадаў імкнуцца сарваць будаўніцтва сацыялізму ў адзінай у сьвеце пралетарскай краіне".

„Мы дасылаем гарачае братэрскае прывітаньне—гаворыцца ў канцы рэзалюцыі—усім эксплёатаваным у краінах капіталу і таксама нашым свабодным ад капіталістычнага ярма сёстрам Савецкага Саюзу, актыўным удзельнікам сацыялістычнай будоўлі".

У прав нцыі 8-га сакавіка было адзначана шматлікімі мітынгамі, якія ўцягнулі новыя пласты работніц. Так, у горадзе Німе на сходы прышло шмат работніц, якія раней стаялі ў баку ад палітычнага жыцьця. На сходзе была створана група братэрскага саюзу жанчын супроць імпэрыялістычнай вайны, 17 работніц тут-жа на месцы ўступілі членамі саюзу. На другі дзень да іх далучыліся і іншыя работніцы.

У Ангельшчыне напярэдадні 8-га сакавіка ў прамысловых цэнтрах адбыліся лятучыя мітынгі каля варот прадпрыемстваў. 8-га сакавіка мелі месца рад сходаў і дэманстрацый у Лёндане, Бірмінгаме, Глязго, Бэрнлеі, дзе нядаўна тэкстыльшчыцы атрымалі бліскуючую перамогу дзякуючы аднадушнаму свайму выступленьню, прымусіўшы прадпрыемцаў узяць назад свае патрабаваньні, якія значна пагоршвалі ўмовы працы работніц.

У Галяндыі 8-га сакавіка прайшло пад лёзунгам стварэньня адзінага фронту дапамогі прыгнечаным працоўным жанчынам Калёніі.

З. Баярская.

Працоўныя жанчыны Заходняй Беларусі ў першых радох барцоў за рэвалюцыю

Усе цяжары эканамічнага крызісу, які перажывае фашыцкая Польшча, асабліва моцна адчувае на сабе працоўная жанчына Заходняй Беларусі і Польшчы. Голад, нэндза, беспрацоўе, безьзямельле сялянскіх мас—усё гэта тая цяжкая рэчаіснасьць, у якой прыходзіцца жыць работніцы і сялянцы Заходняй Беларусі.

Сярод яшчэ працуючых пралетараў Заходняй Беларусі—каля 25 проц. работніц. Работніца эксплёатуецца яшчэ ў большых разьмерах, чым рабочы. Па ўсёй Заходняй Беларусі ліквідаваны 8-мігадзінны рабочы дзень. Работніца, як правіла, працуе па 12 гадзін і нават 14 гадзін у дзень. Заработная плата рабочых і работніц зьменшана толькі за адзін 1930 год у сярэднім на 25—30 проц. Фабрыкант, гаспадар майстэрні зьдзекуюцца з работніцы, імкнучыся зрабіць з яе маўклівага і паслухмянага нявольніка.

Беспрацоўе, якім па Заходняй Беларусі ахоплена каля 100 тысяч рабочых, з асаблівай сілай б'е па працоўнай жанчыне. Маткі ня маюць чым карміць сваіх дзяцей. Значна павялічылася лічба фактаў галоднай сьмерці. Фашыцкі ўрад не дае ніякай дапамогі беспрацоўным. Заўтрашні дзень нясе для кожнай работніцы толькі пагоршаньне яе матар'яльнага становішча, толькі голад і беспрацоўе.

Працоўная сялянка Заходняй Беларусі таксама, як і ўсё працоўнае сялянства, жыве ва ўмовах нячуванай памешчыцкай эксплёатацыі, пастаяннага голаду, вялізарнага беспрацоўя і безьзямельля. Фашыцкі ўрад разам з папамі і ксяндзамі імкнецца ўтрымаць працоўную сялянку ў цемнаце і веры ў „лепшую будучыню", якую яна атрымае... „на небе пасьля сьмерці". Жорсткі сацыяльны і нацыянальны ўціск акупантаў робіць усё жыцьцё працоўнай жанчыны катаргай і страшэнным пеклам.

Усялякія сацыял-здрадніцкія і нацыянал-фашыцкія партыі дапамагаюць фабрыкантам і памешчыкам эксплёатаваць працоўную жанчыну і трымаць яе ў пастаяннай цемры і палітычнай пасыўнасьці. Гэтыя верныя агенты і служкі Пілсудзкага дабіваюцца таго, каб жанчына ня прымала ўдзелу ў рэвалюцыйнай барацьбе, каб яна верыла толькі ў бога і „магутнасьць" фашыцкай дыктатуры Пілсудзкага.

Крывавы тэрор акупантаў бушуе на землях Заходняй Беларусі. Гэты тэрор б'е па шырокіх масах працоўных жанчын. Турмы трымаюць за сваімі сьценамі не адзін дзесятак лепшых работніц і сялянак Заходняй Беларусі, якія разам з усімі працоўнымі актыўна змагаліся супроць фашызму.

Фашызм, які рыхтуецца да крывавай вайны супроць сацыялістычнай бацькаўшчыны ўсіх працоўцых—СССР, адначасна з крывавым тэрорам праводзіць узмоцненую мілітарызацыю жанчын. Па ініцыятыве фашыцкіх жаночых арганізацый акупанты прынялі закон аб абавязковай мабілізацыі жанчын для „ўсеагульнай грамадзянскай службы". Гэты закон зьяўляецца фактычным уцягненьнем жанчын на вайсковую службу, на абавязковае выкананьне вайсковых работ у часе вайны. Пры фашыцкіх баявых арганізацыях ствараюцца спэцыяльныя жаночыя групы, жаночыя вайсковыя курсы і г. д. Усё гэта робіцца для падрыхтоўкі антысавецкай вайны. Усё гэта робіцца для таго, каб жаночыя масы закаваць у ланцугі фашыцкіх уплываў.

Але па ўсёй Заходняй Беларусі, таксама як і Польшчы, расьце і абвастраецца рэвалюцыйны рух, у якім прымаюць актыўны ўдзел работніцы і сялянкі. У забастовачнай барацьбе прымаюць вялікі ўдзел



Паліцыя разганяе дэманстрацыю ў Нью-Ёрку

работніцы і батрачкі. У забастоўках, якія адбываліся ў апошні час у Беластоку, Вільні, Горадні і г. д., жанчыны складалі значную частку баставаўшых рабочых.

Асаблівая актыўнасьць працоўных жанчын адзначаецца ў барацьбе беспрацоўных. На чале цэлага раду дэманстрацый і баявых выступленьняў беспрацоўных ішлі жанчыны. У Кобрынскіх дэманстрацыях у дзень 25-га лютага сялянкі і работніцы былі самым актыўным элемэнтам. У аднэй з вёсак Берасьцейскай акругі жаночая дэманстрацыя ўварвалася ў паліцэйскі пастарунак і не дала катаваць палітзьняволеных сялян.

Усё больш актыўны ўдзел прымаюць працоўныя жанчыны і ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе працоўных Заходняй Беларусі супроць польскіх акупантаў і іх верных агентаў—беларускіх нацыянал-фашыстаў. У гарадох і вёсках лепшыя прадстаўнікі работніц і працоўных сялянак уваходзяць у рады нелегальнай КПЗБ. Вялікімі ўплывамі сярод жаночай працоўнай моладзі на вёсцы карыстаецца КСМЗБ. Працоўныя жанчыны ўцягваюцца ў рэвалюцыйную барацьбу супроць ваенных плянаў Пілсудзкага—Пуанкарэ, у абарону Савецкага Саюзу і Савецкай Беларусі. 8-е сакавіка гэтага году прайшло пад знакам барацьбы супроць фашыцкага ўраду—ураду голаду, тэрору і вайны, прайшло пад знакам актыўнай абароны савецкай краіны ад ваеннага нападу, які рыхтуецца польскімі і французскімі імпэрыялістамі.

Сярод шырокіх працоўных мас жанчын расьце папулярнасьць СССР. Праўда аб нашай краіне прасякае ў самыя глухія куткі Заходняй Беларусі і падымае там да рэвалюцыйнай барацьбы новыя масы працоўных жанчын.

Працоўныя жанчыны БССР павінны выступіць з гарачым пратэстам супроць крывавага тэрару акупантаў і адначасна з гэтым прадэманстраваць сваю непарыўную гатоўнасьць з работніцамі і сялянкамі Заходняй Беларусі.

А. Альшэўскі.

БАТРАЧКА

(ПРАЦЯГ)

(Апавяданьне Н. Рэвунцова)

III.

Цягнецца Моця ў лапцях па гразкай дарозе да Ванькі. Ідзе ды абыходзіць лужы. Вузкія дарогі ў нашым месцы—не шасэйныя, гразкія, як балотная твань. Якія боты ні надзень—насквозь прамочыш. Пра лапці і гаварыць няма чаго. Рэчь дзіравая, ступіў—і нага чвакае.

„Калі-б не галеча — не пашла-б,--думае Моця, успамінаючы Ваньку.—Дый што я яму скажу, калі сама пакахала хлапца?“

Сорамным здавалася Моці патрабаваць алімэнты ад Ванькі. Не падабалася неяк гэта слова, не па сэрцы было, калі пра каханьне гаварыла многім: „Быў-бы мілы па душы, пражывем і ў шалашы“. „Дый што з яго ўзяць? Чым ён дапамагчы можа? Лепш-бы са мной ажаніўся“.

Так па-свойску разважала Моця пра Ваньку, узьбіраючыся з горкі на ўзгорак, пераходзячы размывы, раўчакі і маленькія вёсачкі, недалёка расстаўленыя адна ад другой. Праходзіла Моця платы з аднэй і дзьвёх жэрдак, перакінутыя з берагу на бераз праз маленькія рачулкі. У тахт бульканьню высока ў небе чулася крумканьне жураўлёў, што лятуць насустрач Моці. І думалася Моці, што жураўлі з ёю віталіся і сваім радасным крыкам манілі яе з сабою. Моця спынялася, закідвала галаву, углядаючыся ў бязьмежную сінь, у момант знаходзіла жураўлёў і не адрывала ад іх вачай, пакуль жураўлі не хаваліся з віду.

„Як добра ім з крыльлямі: Праляцяць і ног не памочаць“.

Зайздросьціла Моця вольным птушкам. Раўнала жураўлёў з чалавекам: „Здалёк здаюцца таксама адзінокімі, як і людзі, мабыць, і з птушак таксама розныя ёсьць“.

Па дарозе амаль нікога ня сустрэла Моця. Людзі працавалі на полі, згодна ўздымалі зямлю пад ярыну.

Сярод хлебаробаў цікавыя спыняліся, паглядалі на Моцю, што ішла адна па дарозе. Цікавіліся—чыя, ды адкуль, ды куды ідзе ў такі гарачы час? „Бадай, справа ёсьць важнейшыя, чым сяўба“,—думалі многія.

Праўда, гэтай вясной у Крыўцоўскім раёне пасьпяшыліся з сяўбою таму, што адставаць ад іншых не хацелі. Ужо калі хто зробіць пачатак, іншыя не адстануць, усе адзін за адным высыпаюць у поле, цягнуцца за саўгасам. Зірнуць сяляне на саўгаскія палі—нікога няма, апрача трактара.

У Моці дух заняло, калі падыйшла яна да вялікага роўнага поля Фамінскага. Тут пасярэдзіне поля—узгорак, а на ўзгорку высокія адвечныя ліпы зьбіліся ў кучу. Цікавы гэты ўзгорак, высокі. Калі ад'ехаць ад яго ў любы бок вёрст за 30, азірнуцца—і ўзгорак нібы перад табою вырасьце. Ад узгорку ідзе спуск у нізіну, а за ёю з гары добра відна вялікая вёска. Дом Палуекта Флягонтавіча асабліва вызначаўся. Адзін бок зялёнага даху асьвятляўся сонцам.

Ісьці заставалася недалёка. Ад Вялікай вёскі, у якой жыла Моця батрачкай, да Ванькі заставалася рукой падаць, прайшоў узьлесак і—яго вёска. Моця прыбавіла кроку, спусьціўшыся на луг. На лузе прыемна пахла сьвежай травой. У мінулым годзе на лузе весела было, касілі камунай—трыма вёскамі. Калі накосяцца дзяўчаты— паразьвязваюць чырвоныя хусткі, надзенуць іх на косы і ідуць, як са сьцягамі, усю дарогу да самага дому песьні сьпяваюць.

Моця гэты час асабліва памятае. Касцы падзяліліся на дзьве партыі—мужчын і жанчын, і ўсе касілі лепш адны за другіх. Старыя весела пакрыквалі: „Касавіца, час гарачы, тыдзень—год корміць. Варушэцеся, дзяўчаты!“

Моця не адставала, сярод чужых людзей лепш касіла, чым дома. Скідала з сябе амаль усё, у аднэй саматканай кашулі заставалася. Касіла так, што каса мые, а бок ные. Калі садзіліся адпачываць, пажылыя бабы дакаралі Моцю:

— Бяссумленная, мужыкоў ці што ад нас адбіць надумалася? Скінула-б апошняе і агалілася.

Замест адказу Моця падбухторыць сябровак і пачне з імі сьпіхаць баб у раку. Усіх перакупаюць ды перамочаць. Іншыя нават лаяліся, ня лезьлі гвалтам у ваду, але дзяўчаты не супакойваліся, няўмысьля такіх больш мачылі.

Ванькаву матку раз Моця таксама пад рэчку цягнула, ды толькі ня выкупала. „Матам“ аблажыла Моцю за гэта. Моця нават зьдзівілася.

— Ды што ты, цётка Фрасіньня, мы жартуем, а ты, як мужык, лаешся?

— Але лаешся, калі ты каго хочаш з цярпеньня выведзеш!—паказвала зубы Фрасіньня, злуючыся на Моцю.

—Ты глядзі, ня вельмі яе лай, можа нявесткай будзе... Бач, кам-

самолец твой за ёю здорава ўвіхаецца, ньяўмысьля падпякалі бабы Фрасіньню, падміргваючы Моці. Фрасіньня надувалася: „Патрэбна мне такая раскепа, што ў ёй добрага ёсьць?“

Да Ванькавай вёскі хоць і мала засталося, але Моці пад вечар праз узьлесак аднэй ісьці здалося боязна. Засумавала, не забыўшы лета, пражытага ў Палуекта Флягонтавіча, паращыла па дарозе зайсьці да яго.

„Можа ня скажа: чаго вочы паказала?“—памятала яна яго словы пры разьліку. Ля бяскрылага млына, што стаяў амаль ля самай вёскі, Моця разула гразкія лапці. Да дому Палуекта Флягонтавіча накіравалася навозамі. Дом Палуекта Флягонтавіча ад іншых хацінак стаяў у баку, ля круглай сажалкі, агароджан высокім плотам, пафарбаваны ў такі-ж зялёны колер, як і дах.

„Калі ня пусьціць пераначаваць, запытаю Ванькава прозьвішча і вярнуся,—думала ля ганку Моця, доўга абціраючы ногі.—Добра-б Ваньку сустрэць, кінулася б да яго, можа зразумеў бы мяне!“.

IV.

Нечаканы прыход Моці Палуекта Флягонтавіча бязьмежна ўзрадаваў. Углядаючыся ў бледны твар батрачкі, ён прасьвятлеў, старое адлягло ад сэрца.

„Убрала чэрава, мабыць, задушыла“, у момант падумаў Палуект Флягонтавіч.

Моця таксама ў свой час так думала, калі апошнія месяцы даношвала. Толькі і цьвердзіла: „Задушу дзіця, многія так робяць“ Але калі нарадзіла, рукамі пляснула і ўголас прызналася перад народжаным: „З-за такога нявіннага маленечкага пачалі-б мяне па судох цягаць ды ў турме гнаіць—ні за што!..

Моця чуць не пачала плакаць, сеўшы на краёк лаўкі. Палуект Флягонтавіч затурбаваўся каля самавару, парашыўшы, што Моця да яго прышла зноў батрачкай прасіцца. Гаспадыні ня даў і словам перакінуцца з Моцяю, адправіўшы яе за перагародку да печкі. Завазілася гаспадыня ля печкі з самаварам.

Агледзела Моця хату. Хата тая-ж самая, толькі на абразох копаці пабольшала. У звычайных выпадках Моця доўга не задумвалася, гаварыла адразу, а тут чагосьці саромілася. Палуект Флягонтавіч, надзеўшы рубашку, калі прышла Моця, з гонарам сядзеў за сталом, падпёршы кулаком галаву. Доўга Моця пазірала на яго зацісьнутую бараду, а потым ціха сказала, па якой справе зайшла.

Стары слова ня вымавіў, нават віду не паказаў, што словы Моці яго пасадзілі на вострыя штыхі. Адна гаспадыня была зьдзіўлена навіною, высунуўшы з-за перагародкі твар з разяўленым ротам.

— Як-жа цяпер? Ванька-ж ажаніўся!—сказала гаспадыня.

Гарбату пілі моўчкі. Палуект Флягонтавіч падсоўваў талерку да Моці, частаваў белай капустай і бульбай. Гаспадыня прэсным пірагом частавала:

— Закусі, пі гарбату, галодная-ж з дарогі!

— Ды не, ня вельмі, з дому два апрэсьнічкі ўзяла. Перакусіла па дарозе... „Не да яды тут!“ хацела адказаць ёй Моця, даведаўшыся, што Ванька ажаніўся! Доўгае маўчаньне Моцю непакоіла, каялася, што пасьпяшыла сказаць пра алімэнты.

Палуект Флягонтавіч частаваў госьцю, стараючыся не пазіраць ёй у твар. Моця ведала, якая гэта гасьціннасьць. Для яе было-б лепш, калі-б Палуект Флягонтавіць назваў яе чым ні ёсьць апошнім, горшым словам. Бо ў такіх выпадках чалавек аблае і тут-жа пра ўсё забудзе, але Палуект Флягонтавіч быў не з такіх—злосьць добра памятаў.

Гаспадыня надакучвала Моці:

— Каго-ж табе бог даў: сынка ці дачку?

— Дачку, Акуліна Палікарпаўна!—неахвотна адказала Моця.

— Ня вельмі бядуеш?—даведвалася Акуліна Палікарпаўна, нібы шкадуючы Моцю.

— Аб чым бедаваць?—буркнуў за Моцю Палуект Флягонтавіч, не пазіраючы на жонку.—Не адна яна—маці, і ня нам, старым, судзіць пра гэта. А ты еж, а там і спаць. Заўтра ўжо дабяжыш да Ванькі, можа згаворыцеся як-небудзь,—працадзіў Моці гаспадар.

— І то правільна, пераначую.

Моця падзякавала за вячэру і хацела прыбраць са стала па прывычцы сама, але гаспадыня вырвала з Моціных рук ручнік, а яе палажыла на палаткі. Калі на палатках пачулася моцнае храпеньне Моці, Палуект Флягонтавіч у момант апрануўся і ціхенька выйшаў. У сенцах ён наткнуўся на Акуліну Палікарпаўну, якая аберуч несла жалезную дайніцу, поўную малака.

— Но замыкай дзьвярэй, я праз некаторы час вярнуся,— ціха сказаў ён старой і выйшаў з сянец.

Упоперак вёскі Палуект Флягонтавіч прайшоў у бок свайго гумна павольна, што ўсякі, хто-б яго сустрэў, мог-бы падумаць, што ён проста гуляе ад адсутнасьці работы. Але калі Палуект Флягонтавіч спусьціўся з гары к лесу, над ім згасаў бура-малінавы захад, то пабег, падтрухваючыся, нібы каго-небудзь даганяў. Ён быў такі злы на Моцю, што калі-б яна яму пра алімэнты сказала ў лесе, ён-бы, не задумаўшыся, забіў-бы яе на месцы. „Так, так, хвацка прыдумана... Патрабаваць прышла... Гэх, сучка, ай, дзярмо паршывае!..

У Палуекта Флягонтавіча ўсё нутро пераварочвалася. На гэта



„Убрала чэрава, мабыць, задушыла“.

ў яго былі свае прычыны. Яны якраз і прымусілі, не чакаючы ні хвіліны, хутчэй бегчы да Ванькі. На няцьвёрды характар пляменьніка ён не спадзяваўся. Ён ведаў Ванькаву прывязанасьць да Моці і іх спатканьня баяўся больш за ўсё.

„Што калі сустрэнуцца, ды не разыдуцца?“ Пры гэтай думцы ў Палуекта Флягонтавіча дух займала. Здарылася-б такая гісторыя—і Палуект Флягонтавіч загінуў-бы, як кажуць, ні за нюх табакі. Першы сват Захар Ігнатавіч можа папсаваць усю справу за абразу сваёй дачкі. З таго часу, як сталі яны сватамі, Захар Ігнатавіч для Палуекта Флягонтавіча вялікую справу зрабіў па зямельнай і падатковай справе. Наконт зямлі хоць і мала было зроблена, але Палуектам Флягонтавічам бралася пад увагу і гэта. Зямлі ў Вялікай вёсцы хапала. Палова вёскі—шапачнікі, жывуць ў Маскве з сем'ямі. Прыяжджаюць у вёску на кароткі час, толькі на „каляды“ і ўлетку, нібы на дачу, а там заб'юць вакенцы дошкамі і зноў у Маскву шапкі шыць, а пра зямлю і ня думаюць. Палуект Флягонтавіч ад лішняй зямлі не адмаўляўся, наймаў работнікаў і абрабляў яе. І Захар Ігнатавіч трымаў яго руку: дзе старым самім працаваць, калі з гадоў абое вышлі, па закону непрацаздольнымі лічацца! Нельга з іх вялікі падатак браць.

Разьвёўся-б цяпер Ванька, і Палуект Флягонтавіч паляцеў-бы ў бяздоньне.

— Ды тут мяне падаткам замучаць! —шалеў ён і станавіўся сам ня свой.

— Не, не, не дапушчу!.. Сам затраплю.

Моцна завязан вузел і не па нутры яму было, каб яго хто разьвязаў. „Сам зраблю, прыдумаю, але ня дам, ня дам ёй ні патрабаваць, ні ганьбіць.

Каня і карову, якія былі адданы Ваньку Палуектам Флягонтавічам, як пасаг дачцы Захара Ігнатавіча, ён прыкідваў цяпер ужо Моцінымі, ён упэўнен быў—падала-б Моця ў суд на Ваньку, і суд прысудзіў у карысьць Моці. Нават і сьведак ня трэба будзе, калі хлапчукі і тыя ведалі, як гуляў Ванька з Моцяй.

Палуект Флягонтавіч так разышоўся ў думках, што не заўважыў, як падышоў да ванькавай хаты. Перад яго прыходам толькі разышліся па хатах хлапчукі, што гулялі тут ля ванькавай хаты. Ванька сядзеў на ганку і хутка дакурваў цыгарку, часта падносячы яе к губам. Цыгарка з кожным разам разгарвалася, асьвятляючы твар Ванькі ў чырвоны колер. Палуект Флягонтавіч кашлянуў і, не прывітаўшыся з Ванькам, ціха клікнуў яго да сябе.

— Нічога не адчуваеш, чаго я прышоў?

— Не, не адчуваю, а што?— настаражыўся Ванька, падумаўшы: ці не пакража часамі ў дзядзькі.

— Кепска, што не адчуваеш, значыцца, бястурботна жывеш.

Гаварыць галоўнае не сьпяшаўся Палуект Флягонтавіч, прыдумваў, якім-бы словам лепш агарошыць пляменьніка. Пад паветкай, дзе стаялі калёсы і дровы, Палуект Флягонтавіч шушукнуў Ваньку:

— Валацужніца прышла, алімэнты патрабаваць з цябе!

— Якая валацужніца?—не здагадаўся Ванька.

— Ды Моцька, вось якая, забыў ці што?

— Моцька?—моцна, з хрыпатой пераказаў Ванька, выцягнуўшы шыю і разглядаючы ў цемры ваўасатую галаву дзядзькі, вельмі падобную да куста ядлоўцу. Амаль год Ванька пражыў з жонкай і мала неяк успамінаў пра Моцю, а зараз нібы яна ўстала перад ім, узяла за горла і душыць.

У яго захадзілі рукі. Ванька рвануўся.

— Ад каго ты пра гэта даведаўся?

— Цішэй, не гарачыся, астынь!—стрымліваў Ваньку Палуект Флягонтавіч, баючыся, каб хто не падслухаў.—Ты вось што скажы: ці было ў цябе што з ёю?



Івае гэта дз'ця? Мне штосьці ня верыцца...

Ванька маўчаў, дзядзька падпільваў:

— Тваё гэта дзіця? Мне штосьці ня верыцца, хлапец! Ванька закалаціўся:

— А што калі і па праўдзе не ад мяне?

— Вось у тым-то і справа, хлопча! — прагаварыў Палуект Флягонтавіч. Яго хітрасьць апякла Ваньку. Ён адразу ўспомніў Грышку—рымара, пра якога яму гаварыла Моця, называючы Грышку траплом. Раней, калі Моця сьмяялася з Грышкі, Ванька заліваўся рогатам, а тут ён узьненавідзеў Моцю, думаючы—можа за тое і не кахае больш Грышку, што з яго няма чаго ўзяць... З мяне садраць хоча. Мала яшчэ што?... Чакай да ягнят, а ягнят ваўкі зьядуць.

Дзядзька радаваўся, што Ванька кіпеў і вышаў з сябе. Параіў яму, добра абмеркаваўшы яшчэ ўсё за гарбатай, калі частаваў Моцю.

— Забі ты яе,—вось што. Пойдзе яна заўтра да цябе праз лес, ты яе і падпільнуй. Забілі і забілі... Дапытвацца ня будуць—хто?

Па Ваньку прабег мароз ад дзядзькавай парады.

— Нешта боязна, ці пройдзе ўсё добра?

— Чаго там? Боязна—гарэлкі хопіць, дый і сып. Выявіцца—замажам. Пры цары тут ня тое было—забіць бабу лічылася ні за што. І табе баяцца няма чаго,—распальваў ён Ваньку, падліваючы масла ў агонь.—Дурнем будзеш, калі хамут на шыю надзенуць.

Ванька доўга не здаваўся.

— Усё-ж такі страшна!

— Алімэнты плаціць яшчэ страшней, — налягаў на сваім дзядзька.—Для нежанатага зышло-б, а для жанатага—сам памяркуй: жонка сем год казлом пазіраць будзе.

Палуект Флягонтавіч крыху перадыхнуў, хацеў сказаць пра Захара Ігнатавіча,—як ён яму на вочы пакажацца,—але знайшоў гэта лішнім.

— Думай, як хочаш,—ідучы ад Ванькі, злосна кінуў Палуект Флягонтавіч.—Мая гаспадарка ад цябе не ўцячэ, але толькі хто яе атрымае: ты ці Моця?

(Канец будзе)

У выніку правільнага парткіраўніцтва

Фабрыка „Камунарка“ дабілася датэрміновага выкананьня прамфінпляну першага кварталу на 115 проц.

Прамфінплян першага кварталу трэцяга рашаючага менская цукерная фабрыка „Камунарка“ выканала датэрмінова. **29-га сакавіка вытворчае заданьне трэсту выканана на 115 проц., па сустрэчным—на 102 проц.**

Гэтых посьпехаў фабрыка дабілася дзякуючы правільнаму партыйнаму кіраўніцтву, добрай масавай рабоце фабрычных арганізацый сярод рабочых і работніц. У сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ўцягнута 80% рабочых і работніц. Рэшта 20% гэта новыя рабочыя і работніцы, якія нядаўна прышлі на фабрыку. Сярод іх праводзіцца асобная растлумачальная работа—нарады ў кожнай дэкадзе. За другую палову сакавіка ўжо арганізаваны сярод новых рабочых і работніц дзьве ўдарныя брыгады.

Былі і труднасьці, перабоі ў рабоце—недахват апалу і сырцу. Але рабочыя і работніцы „Камунаркі“ сваім энтузіязмам, сацыялістычнымі адносінамі да працы ўсе труднасьці перамаглі.

Як-жа на фабрыцы пабудавана масавая работа? У сувязі з пастановай ЦК УсеКП(б) аб перабудове партмасавай работы ў цэхах, бюро парткалектыву ў сакавіку вылучыла асобных партыйцаў для абслугоўваньня рабочых усіх зьмен. Гэтыя партыйцы праводзяць гутаркі з рабочымі другой і трэцяй зьмены па тых пытаньнях, якія абгаварваюцца ў часе абедзеных перапынкаў на першай зьмене.

Пасьля ўказаньняў бюро партыйнага калектыву палепшылася і адміністрацыйнае кіраўніцтва ў начныя зьмены—часта дзяжураць у начныя зьмены дырэктар і яго намесьнікі.

Нядаўна фабком стаў ужываць вопыт правядзеньня сходаў тых рабочых, якія былі выходнымі ў дзень правядзеньня агульнага сходу. Рабочыя вельмі задаволены тым, што іх ставяць у курс справы тых пытаньняў, якія абгаварваліся на фабрыцы, калі яны былі выходнымі.

Перад яўрэйскім вялікаднем была праведзена сярод рабочых вялікая антырэлігійная работа. Былі гутаркі ў часе абедзеных перапынкаў па ўсіх зьменах. У выніку гэтага ў **першы дзень яўрэйскага вялікадня ніводнага прагулу ня было** (на фабрыцы 60 проц. яўрэяў). **Нават тыя рабочыя, хто ў той дзень былі выходныя, прышлі працаваць, каб паказаць свой пратэст супроць рэлігійнага дурману.**



Загадчык карамельнага цэху тав. Глайхэнгаў, сочыць за работай.

Парткалектыў разьмеркаваў партыйныя сілы па цэхах так, каб у кожнай брыгадзе быў партыец або партыйка (на фабрыцы 80% работніц). Вылучаны зьменныя і вучастковыя (агрэгатныя) парторгі. Праз дзень ва ўсіх зьменах праводзяцца ў часе абедзеных перапынкаў гутаркі з рабочымі па розных палітычных пытаньнях. Вынікі перабудовы партработы ўжо далі сябе адчуваць—больш усяго заяў у партыю ад рабочых паступіла ў сакавіку. Калі ў лютым было толькі 5 заяў, дык у сакавіку было 12. З іх 10 ад работніц.

Для ўзьняцьця культурна-палітычнага ўзроўню бюро парткалектыву арганізавана сэмінары „трыкутнікаў“ цэхаў і брыгад усіх зьмен, якія займаюцца раз у дэкаду. Вучацца 42 партыйцы, у тым ліку 30 камуністак. Аднак, трэба адзначыць, што пры добрым правядзеньні ў асноўным усёй палітвыхаваўчай работы, з кандыдатамі партыі работа праводзіцца слаба. На гэты вучастак работы парткалектыву трэба зьвярнуць больш увагі.

Вытворчыя камуны на фабрыцы працуюць добра. У мяккашакаладным цэху ўжо год арганізавана камуна ўпакоўшчыц.

— Калі мы ўвайшлі ў камуну—гаворыць камсамолка тав. Вэнзэль—норма выпрацоўкі была 120 кілёграм у дзень. Мы заразжа паднялі норму выпрацоўкі на 35 проц., а ў сакавіку гэтага году—яшчэ на 15 проц. Вынікі такія—да арганізацыі камуны кожная работніца пакавала 200 кілёграм у дзень, а цяпер мы пакуем па 400—450 кілёграм у дзень у сярэднім.

У дзень восьмага сакавіка 20 работніц, лепшых ударніц, былі прэміяваны.

Сацыяльна-бытавыя пытаньні яшчэ не займаюць належнага месца на фабрыцы „Камунарка“. Ужо пабудавана новая фабрыка, хутка яна будзе адкрыта, але **аб пабудове ясьляй адміністрацыя зусім забыла**. Гэта—парушэньне закону ўраду аб тым, што побач з прамысловым будаўніцтвам павінны будавацца бытавыя ўстановы.

Дрэнна пастаўлен улік рацыяналізатарскіх прапаноў. Бюро рацыяналізацыі не стварыла вакол сябе рацыяналізатарскага актыву з рабочых і работніц. Наогул загадчык бюро рацыяналізацыі тав. **Пташнікаў** мала цікавіцца гэтай работай.

Парткалектыву трэба ўлічваць усе недахопы, якія яшчэ ёсьць у працы паасобных зьвеньняў фабрыкі. Трэба, каб фабрыка „Камунарка“ была ўзорнай па ўсіх паказальніках, як яна ўзорна па выкананьні і перавыкананьні прамфінплянаў першых год пяцігодкі і першага кварталу трэцяга рашаючага.

Вопыт масавай работы фабрыкі „Камунарка“ павінны пераняць усе прадпрыемствы БССР.

А. Зоркая.

Ударым па апартуністычнай недаацэнцы работы сярод працоўных жанчын

У Бягомлі недаацэньваюць работу сярод жанчын

У Бягомльскім раёне надта слаба пастаўлена работа сярод працоўных жанчын. Жанчыны ня ўцягнуты ў грамадзкую работу. Клясавы вораг выкарыстоўвае несьвядомасьць адсталай часткі працоўных сялянак і стараецца праводзіць праз іх сваю агітацыю.

Там, дзе работа сярод жанчын здавальняюча пастаўлена, жанчыны прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы, напрыклад, калгасьніцы калгасу „Усход“ і аднаасобніцы вёскі Ліпск стварылі ўдарныя брыгады па вярбоўцы ў калгас, па зборы попелу, па апрацоўцы ільну і г. д. Гэтыя вынікі мы маем таму, што брыгада Менскіх рабочых-харчавікоў праводзіць работу сярод жанчын.

Працоўныя жанчыны Бягомльшчыны ўсьвядомілі перавагі буйнай сацыялістычнай гаспадаркі над дробнай індывідуальнай. Вось характэрны факт. Тав. **Шыла Грыпіна**, уступаючы ў калгас, заявіла: **„кулацкай агітацыі дапамагае мой муж Шыла Янка і таму я, з двума дзецьмі ўступаю ў калгас, а з мужам жыць ня буду, пакуль ён будзе разам з кулакамі пагражаць беднаце і пакуль ня ўступіць у калгас“.** Такое-ж зьявішча было і ў Бягомлі, калі жонка **Кургана Сяргея** доўга ўгаварвала свайго мужа, каб ён уступіў у калгас. І сапраўды пасьля гэтага ён уступіў у калгас.

Дэлегацкі сход у Бягомлі не працуе, ня гледзячы на тое, што пад бокам знаходзяцца РК КП(б)Б РВК і партыйная ячэйка. Дэлегаткі, прымацаваныя да розных устаноў, на пасяджэньні не запрашаюцца.

Таксама адсутнічае і культ-праца сярод жанчын. Ліквідацыя няпісьменнасьці праходзіць не здавальняюча. Лікпункты працуюць ненармальна, асабліва ў самым Бягомлі, дзе за апошні час лікпункт зусім не працуе, бо **настаўніца Булёнава выкручваецца** ад работы. А няпісьменных жанчын у Бягомлі шмат.



Лепшая ўдарніца калгасу „Новае жыцьцё“, Койданаўскага р., тав. Верба.

Распаўсюджаньне часопісі „Беларуская работніца і сялянка“ пастаўлена дрэнна. Па ўсім раёне выпісваецца ўсяго каля 200 экзэмпляраў у той час, калі ў раёне ёсьць звыш 8 тысяч сялянскіх гаспадарак.

Некаторыя партыйныя ячэйкі раёну імкнуцца замазаць пытаньне аб працы сярод жанчын. Напрыклад, сакратар Бярэзінскай партячэйкі тав. Багуцкі заяўляе: „У мяне праца з жанчынамі пастаўлена на належную вышыню, але вось бяда, што сабраць іх цяжка“.

Бытавы камітэт пры РВК існуе толькі на паперы. Старшыні часта мяняліся, а цяпер нават невядома, хто зьяўляецца старшынёю бытавога камітэту.

Селькораўскі рух сярод жанчын Бягомльшчыны зусім слаба разгорнут. Па раёне ёсьць усяго 16 селькорак, з іх толькі дзьве калгасьніцы.

РК КП(б)Б павінен зараз-жа наладзіць работу сярод жанчын. Трэба рашуча ўдарыць па тых партарганізацыях, якія недаацэньваюць работу сярод жанчын, бо недаацэнка работы сярод жанчын зьяўляецца праяўленьнем правага апортунізму на практыцы.

В. Тэм.

Ячэйка, прачніся!

У дні сталінскага закліку ў калгасы ў вёсцы Раштова, Полацкага райну, арганізавалася ініцыятыўная група з трох аднаасобнікаў. Але падкулачнік Шэф Антось і бядняк Гарчакоў, які знаходзіцца пад уплывам Шэфа, вядуць агітацыю сярод беднаты і жанчын супроць калектывізацыі.

Частка несьвядомых жанчын вёскі выступае на агульных сходах супроць калектывізацыі. Гэта зрывае арганізацыю новага калгасу.

Партыйная ячэйка павінна зараз-жа павесьці растлумачальную работу сярод працоўных жанчын і беднаты вёскі Раштова. **Ч.**

Прыцягнуць грамадзкасьць да пашырэньня сеткі дзіцячых устаноў

Сетка ясьляй і пляцовак, якія будуць адкрыты ў гэтым годзе па лініі Народнага Камісарыяту Аховы Здароўя і Наркамасьветы, далёка ня можа задаволіць запатрабаваньняў саўгасьнікаў і калгасьнікаў. Таму цэнтральны бытавы камітэт пры ЦВК БССР прапанаваў усім раённым бытавым камітэтам склікаць нарады кіраўнікоў бытавых сэкцый сельсаветаў і загадчыкаў культурна-бытавых камісій калгасаў для абгаварэньня плянаў ясельнай кампаніі па раёнах і пастаноўкі пытаньня аб максымальным пашырэньні сеткі бытавых устаноў за кошт мабілізацыі сродкаў калгасьнікаў і саўгасьнікаў.

Для таго, каб ня было перабояў у забесьпячэньні дзіцячых устаноў прадуктамі, цэнтральны бытавы камітэт прапанаваў Наркамснабу і Белкаапсаюзу ўключыць сетку ясьляй і дашкольных устаноў у плянавае забесьпячэньне прадуктамі.

Брыгада часопісі „Беларуская работніца і сялянка“

Розэнблюм, Баранбаум.

ПАМНОЖЫМ РАДЫ ЎДАРНІЦ

10 месяцаў існуюць сьвінагадоўчыя саўгасы ў БССР. За гэты час яны маюць шмат посьпехаў ў сваім будаўніцтве, але адначасова ёсьць яшчэ шмат прарываў і недахопаў, якія перашкаджаюць гэтым саўгасам выконваць ускладзеную на іх адказьнейшую задачу—хутчэй павялічыць вытворчасьць мясных прадуктаў, ліквідаваць труднасьці ў забесьпячэньні рабочых мясам і тлушчамі.

Няпоўнасьцю выконваецца плян укомплектаваньня саўгасаў сьвінаматкамі, слаба разгортваецца будаўніцтва сьвінасаўгасаў і г. д. Галоўны прарыў заключаецца ў тым, што на радзе саўгасаў надзвычай вялікі процант адходу парасят, а гэта зрывае выкананьне плянаў адкорму парасят і здачы таварнай прадукцыі дзяржаве для рабочага забесьпячэньня.

Чым тлумачыцца гэты буйнейшы прарыў? Ён тлумачыцца неразуменьнем таго, што сьвіньня патрабуе самых бярэжлівых і ўважлівых адносін, што яна патрабуе чыстаты і пастаяннага добрага догляду. Практыка паказала, што няма ніякіх „аб'ектыўных" прычын упадку сьвіней і згубы апаросаў. Ёсьць толькі адна прычына — гэта дрэнны догляд, незахаваньне зоавэтмінімуму, несваячасовае і дрэннае кармленьне і г. д., гэта значыць усё тое, што залежыць ад працы людзей, якія пастаўлены даглядаць сьвіней.

Аб гэтым трэба асабліва памятаць зараз, калі на падставе тых посьпехаў, якія маюць сьвінагадоўчыя гаспадаркі, на іх ускладзена ў 1931 годзе надзвычай адказная задача: **укамплектаваць саўгасы 75 тысячамі сьвінаматак і здаць дзяржаве ня менш 60 тысяч таварных сьвіней.** Выходзячы з гэтай вялізарнай програмы, на будаўніцтва сьвінасаўгасаў выдаткоўваецца больш 15 мільёнаў рублёў. Выкананьню гэтай праграмы павінна быць падпарадкавана ўся праца сьвінасаўгасаў. На гэта павінны быць пакладзены ўсе сілы рабочых, работніц, адміністрацыі саўгасаў, парт'ячэек і рабачкомаў.

1 усебеларускі зьлёт ударнікаў сьвінагадоўчых саўгасаў, які адбыўся 20—22 сакавіка, абвясьціў сябе мабілізаваным на выкананьне гэтай грандыёзнай задачы, цалкам магчымай для выкананьня праграмы сьвінагадоўлі. Ударніцы сьвінасаўгасаў аднадушна галасавалі за гэту пастанову зьлёту. Ды як ім было не галасаваць за гэта, калі яны на практыцы сваёй працы бачылі і бачаць, што ў першую чаргу іх праца, іх догляд сьвіней вырашае пытаньне захаваньня апаросаў і яго вырошчваньне. Работніцам сьвінарнікаў добра вядомы выпадкі паяданьня парасят і прыдушваньня іх маткамі, захворваньне парасят белым паносам, што здараецца толькі з-за дрэннага догляду. Дэлегаткі зьлёту ўдарнікаў разам з дэлегатамі **самазамацаваліся ў сваіх саўгасах да канца пяцігодкі, абавязаліся поўнасьцю выканаць праграму сьвінагадоўлі 1931 году, у парадку сустрэчнага прамфінпляну дабіцца ня менш 12 таварных сьвіней (замест 10-ці па заданьні) ад аднэй сьвінаматкі ў год.**

Гэтыя-ж задачы могуць быць выкананы толькі тады, калі да рабочых і работніц, якія працуюць пад сьцягам сацспаборніцтва і ўдарніцтва далучацца і ўсе іншы рабочыя і работніцы саўгасаў. Заклік зьлёту ўдарнікаў „вышэй узьняць сьцяг сацспаборніцтва", „памножаць рады ўдарнікаў", „няма ўдарных брыгад без конкрэтных сацыялістычных дагавароў"—павінен зрабіцца заклікам усіх рабочых і работніц саўгасаў у сваёй штодзеннай рабоце.

Работніца вырашае ў значнай ступені справу сьвінагадоўлі, справу разгортваньня працы сьвінасаўгасаў. Ужо зараз кадры работнікаў сьвінарнікаў камплектуюцца галоўным чынам з работніц.

У сувязі з пашырэньнем стада сьвінаматак да 75 тысяч у гэтым годзе і вялізарным ростам стада парасят ў саўгасы ўвальюцца сотні і тысячы новых работніц. Задачы дырэктараў саўгасаў, парт'ячэек і рабачкомаў не абмяжоўвацца тым, што яны гэтых работніц паставяць на работу пры сьвінарніках. Трэба весьці сярод іх глыбокую растлумачальную работу, указаць на іх адказную і пачэсную ролю, па-таварыску дапамагчы ім асвоіцца з новай работай, уцягнуць іх у рады ударнікаў.

У гэтых адносінах вялікую ролю павінны адыграць старыя работніцы саўгасаў — ударніцы. Яны павінны навучыць сваіх новых таварышоў па працы па-пралетарску адносіцца да саўгасу, па-ўдарнаму выконваць свае абавязкі.

„Памнажаць рады ўдарнікаў"—так сказаў зьлёт. Ніводнай работніцы не павінна быць па-за радамі ўдарнікаў. Гэта задача павінна быць выканана.

Ва ўсю шырыню павінна быць пастаўлена і практычна вырашана задача—**ударніца аўладай тэхнікай, агратэхнікай, зоатэхнікай.** У радзе саўгасаў за гэты год былі праведзены курсы па сьвінагадоўлі, работніцы навучаліся на курсах трактарыстаў і г. д. Трэба паставіць перад саўгасамі заданьне ўцягнуць 50 проц. новых работніц у гурткі па вывучэньні тэхнікі, агротэхнікі і зоатэхнікі.

1931 год — рашаючы год пяцігодкі. Ён павінен быць і будзе рашаючым і для работніц саўгасаў як у справе пераключэньня работніц саўгасаў на камуністычныя формы працы, так і ў пастаноўцы вывучэньня тэхнікі работніцамі. Маса саўгасных рабочых і работніц — ударнікаў не палохаюцца труднасьцяй, а змагаюцца з імі і перамагаюць іх. Такая маса выканае ўскладзеныя на яе партыяй і рабочай клясай задачы вырашэньня мясной праблемы.

Г. М. Т.



У Чакасоўскім сьвінасаўгасе. Ангельскія маткі на прагулцы.

Зьмітро Вітралін

Ленскі расстрэл

Быў гэты дзень
Прастрэлены наскрозь
Вясной і сонцам,
Сонцам і вясною...
І кроў цякла
Крыніцаю,
І кроў...
Зямля цьвіла
Гарачаю крывёю...

Шумела ціха
Сумная тайга,
Паволі ў даль
Імклівілася Лена...
Быў гэты дзень
Пазбаўлен ад заган
Таежных дзён
Нудотных і самлелых.
Яны ішлі,



Паліцыя разганяе дэманстрацыю рабочых у Будапэшце.

Па праўду й хлеб ішлі,
Як і браты іх
Калісь у Петраградзе...
Ды раптам зычнае:
Рррр-ота, плі?—
І кулі хлынулі
Сьмяротным градам...
Пяцьсот лягло...
Пяцьсот... братоў... лягло...
О, кат—міністар,
Цябе мы не забудзем.
Мы ведаем,
Што так калісь было,
Але ніколі
Гэтага ня будзе.
Прайшлі часы,
Калі павук-банкір
Ў далёкім Лёндане
Туманным і халодным
Распараджаўся
Золатам ракі
І доляю
Работнікаў галодных.
... А быў-жа дзень,
Прастрэлены наскрозь
Вясной і сонцам,
Сонцам і вясною...
І кроў цякла,
Крыніцаю,
І кроў...
Зямля цьвіла
Гарачаю крывёю.

З лістоў рабселькорак

Няміровіч Алеся вярбуе ўдарніц

Няміровіч Алеся, работніца саўгасу „Беларусь“, Заслаўскага раёну, была на ўсебеларускім зьлёце ўдарнікаў сьвінагадоўчых саўгасаў.

Прыехаўшы на месца, Няміровіч арганізавала сацспаборніцтва і ўдарніцтва па сьвінарніках па доглядзе сьвіней. Там, дзе за 70 сьвіньнямі даглядалі 3 работніцы, яна ўзялася яшчэ з аднэй работніцай працаваць у дзьвёх.

Таксама па-ўдарнаму працуе **Анцыняровіч** Прузына, якая добра даглядае парасят, яна адносіцца да сваёй справы сур'ёзна. **Русовіч В. К.**

У карысьць палітзьняволеных капіталістычных краін

На ўрачыстым вечары, прысьвечаным дню МОПР'у і Парыскай Камуны, у нас было сабрана шляхам выклікаў 35 руб. у карысьць палітзьняволеных капіталістычных краін. Актывісткамі па зборы грошай былі жанчыны.

Крупкі. **Калачынскі Міхась.**

Дапамагаем вязьням капіталу.

Дэлегацкі сход пры пільні „Пралетары“ сабраў у карысьць палітзьняволеных 70 рублёў.

П. Х.

Старыя-Дарогі.

Будуем дырыжабль „Клім Варашылаў“

У дзень 8-га сакавіка працоўныя жанчыны мястэчка Брагіна сабралі на пабудову дырыжабля „Клім Варашылаў“ 250 рублёў. У гэты дзень лепшыя актывісткі былі пераданы ў камуністычную партыю і камсамол. Яўрэйскі дэлегацкі сход падпісаўся на пазыку на 180 рублёў.

Рабкопы ў саўгасах

Па Заслаўскім раёне спажывецкім таварыствам адкрываюцца рабочыя ларкі па ўсіх саўгасах. У саўгасах „Беларусь“, „Зара захаду“, „Камунар“, „Тарасава“ будуць закрытыя разьмеркавальнікі. **Русовіч Віктар.**

ПАРАДЫ ДОКТАРА

Беражыце дзяцей ад менінгіту

(Эпідэмічны цэрэбра-сьпінальны мэнінгіт)

Мэнінгітам называецца запаленьне мазговых абалонак галаўнага і сьпіннога мазгоў. Мэнінгіты бываюць розныя, у залежнасьці ад тых бактэрый, якія выклікаюць гэта захворваньне: мэнінгіт сухотны, мэнінгіт сыфілітычны, мэнінгіт гнойны, выкліканы звычайнымі гнойнымі мікробамі. Але ёсьць і эпідэмічныя захворваньні мазговых абалонак, або, як называюць такое захворваньне, эпідэмічны цэрэбра-сьпінальны мэнінгіт і прычынай яго зьяўляецца асобны мікраарганізм—мэнінгакок.

Гэты мэнінгакок у многіх дарослых людзей знаходзіцца на сьлізістай абалонцы носу, а таксама і глоткі, прычым часьцей за ўсё ён знаходзіцца ў тых асоб, якія хварэюць на хранічныя запаленьні носу і глоткі. Дарослыя людзі хварэюць рэдка на мэнінгіт эпідэмічны, але, будучы носьбітамі бацыляў, г. зн. маючы на сьлізістай абалонцы носу мэнінгакок, яны пры кашлі, пры чыханьні выкідваюць у акружаючае асяродзішча мэнінгакокаў і заражаюць дзяцей, якія надзвычай схільны да захворваньня на эпідэмічны мэнінгіт.

Калі дзіця, такім чынам, атрымала інфэкцыю мэнінгакокам, то пры наяўнасьці момантаў, якія схіляюць да захворваньня, яно захворвае на мэнінгіт. Якія-ж гэтыя моманты? Перш за ўсё сам па сабе *арганізм* дзіцяці, яго спадчынныя якасьці, якія былі раней перад захворваньнем і г. д. Далей, няспрыяючае акружаючае асяродзішча: кепскія санітарна-гігіенічныя ўмовы, цесната, кепскі догляд дзіцяці. Потым кліматычныя ўмовы: малая колькасьць сонечных дзён, вялікая хмарнасьць, багацьце асадкаў, нізкі баромэтрычны ціск, г. зн. якраз тыя акалічнасьці, якія павышаюць жыцьцяздольнасьці мэнінгакока, павышаюць яго вірулетнасьць—здольнасьць выклікаць захворваньне. Нарэшце, у некаторых выпадках такім момантам зьяўляецца ўшыб галавы.

І так, схільнае дзіця, заражанае мэнінгакокам, захворвае на мэнінгіт, і першыя прыметы гэтай хваробы выяўляюцца ў тым, што дзіця пачынае знабіць, павышаецца тэмпэратура, часта да 39°—40°, зьяўляецца ванітаваньне, часамі вельмі бурнае і няспыннае. Сьледам за гэтым у дзіцяці „зводзіць галоўку", г. зн. у дзіцяці галоўка закідваецца назад і яно ўсё выгінаецца: галава і ногі назад, а грудзі і жывоцік уперад. У залежнасьці ад цяжкасьці захворваньня ў дзіцяці можа здарыцца страта прытомнасьці і сударгі, прычым сударгі могуць цягнуцца вельмі доўга і ў некаторых выпадках дзіця памірае ў пэрыяд сударгаў, ня прыходзячы да прытомнасьці. У далейшым сваім працяканьні мэнінгіт мае самыя рознастайныя малюнкі і дае розныя формы: то дзіця, прахварэўшы 2—3 тыдні, пачынае ачуняць, то пасьля нібы адчуняньня зноў хвароба пачынаецца з новай сілай, то яна цягнецца 2—3 месяцы і пасьля гэтага хворы пачынае ачуняць, то мэнінгіт цягнецца месяцамі і нават год, пакуль не зьвядзе хворага ў магілу, або, нарэшце, хвароба адразу ўжо дае цяжкія ўскладненьні—паралюшы, сьлепату, глухату, галаўную вадзянку і інш. Апрача гэтага, трэба адзначыць, што часамі бываюць выпадкі мэнінгіту, якія носяць назву „молниеносных", г. зн. такіх, калі хворы гіне праз некалькі гадзін або праз суткі ад пачатку захворваньня.

Сьмяротнасьць ад мэнінгіту эпідэмічнага, у выпадку адсутнасьці лячэньня, надзвычай вялікая і ў залежнасьці ад цяжару і сілы эпідэміі дае 40—50—60 проц. і нават 90 проц. сьмяротнасьці. Адсюль зусім відавочна, што эпідэмічны мэнінгіт—адно з самых цяжкіх захворваньняў—высокая сьмяротнасьць і цяжкія ўскладненьні, якія робяць хворага на ўсё жыцьцё інвалідам. Апошняя акалічнасьць будзе ў поўнай меры яснай, калі прывесьці такі прыклад: 25 проц. усіх глухіх зьяўляюцца суб'ектамі, якія хварэлі ў маленстве на мэнінгіт.

Аднак, так справа стаіць у тым выпадку, калі хворы не падлягае спэцыфічнаму лячэньню, г. зн. лячэньню процімэнінгакокавай сывараткай. Праўда, сываратка процімэнінгакокавая не зьяўляецца бясспрэчна надзейным сродкам і не заўсёды яна робіць жаданае дзеяньне, але ўсё-ж яна значна скарачае захворваньне і спрыяе ачуняньню, а гэта пры іншых лекавых мерапрыемствах зьяўляецца ўжо вялікай дапамогай. Апрача сывараткі і адначасова з ёю хвораму павінны кожны дзень рабіцца сьпінна-мазговыя праколы, дзякуючы чаму кожны дзень выпускаецца вялікая колькасьць гнойнай сьпінна-мазговай вадкасьці. А калі гэта злучыць з сыстэматычнымі гарачымі ваннамі, то можна дабіцца вялікага посьпеху ў лячэньні эпідэмічнага мэнінгіту. І практыка дзіцячай клінікі паказвае, што пры спрыяючых умовах можна дабіцца 84—88 проц. ачуняньня, поўнага ачуняньня і такім чынам панізіць сьмяротнасьць да 12 проц.

Трэба толькі заўсёды памятаваць, што кожны хворы на мэнінгіт перш за ўсё павінен быць накіраван у больніцу, і чым раней ён будзе накіраван у больніцу і чым хутчэй будзе распачата лячэньне, тым больш шансаў на тое, што ён ачуняе. Гэта цьвёрда павінна памятаць кожная маці, калі хоча, каб яе дзіця было здаровае. Але асноўны прынцып савецкай мэдыцыны заключаецца ня толькі ў тым, каб лячыць хворага, а галоўным чынам у тым, каб папярэдзіць захворваньне.

А як-жа папярэдзіць захворваньне на эпідэмічны мэнінгіт? Кожнае дзіця трэба добра, гігіенічна даглядаць, не падпускаць да яго нікога, у каго ёсьць грып, хто кашляе, хто хварее на хранічны катар носу, на хранічнае запаленьне глоткі, на частыя ангіны і г. д. Калі-ж у сям'і, дзе ёсьць дзеці, сярод дарослых ёсьць вышэй названыя захворваньні, то трэба прымусіць іх пайсьці да доктара і ўзяцца за лячэньне, за аздараўленьне сваіх сьлізістых абалонак носу і глоткі. У мэтах абмежаваньня ўзьнікшай эпідэміі **кожны хворы на эпідэмічны мэнінгіт падлягае ізаляцыі**, г. зн. адлучаецца ад здаровых.

Такім чынам, калі праводзіць гэтыя простыя элемэнтарныя мерапрыемствы, то іх зусім даволі для таго, каб захаваць дзіця ад захворваньня на эпідэмічны мэнінгіт.

Прафэсар В. Леонаў.

Цана асобнага нумару 10 кап.

НАШЫ ДЗЕЦІ

Зьмітро Віталін.

Мы дружна гуляем
На вуліцы
восень сярдуе,
На вуліцы—
злосная дуя
У клюбе-ж—
надзвычайна прытульна,
У клюбе—
дзіцячы наш вулей.
Запраўды,—
мы юныя пчолкі,
Мы—радасьць
і зьзяньне вясёлкі...
Як толькі
апусьціцца вечар,
Засьвецяцца
Леніна сьвечы,—
У клюб
папрыводзяць бацькі нас—
Клімаў,
Маёў,
Акцябрынак...
У клюбе
нам добра, прытульна,
У клюбе дзіцячы наш вулей.
І праўда,
мы—юныя пчолкі,
Мы—радасьць
і зьзяньне вясёлкі.

Што зроблена па допісах рабселькорак

Калгас „Пражэктар“ ачышчан ад чужых элемэнтаў

На заметку, у якой пісалася аб засьмечанасьці калгасу „Пражэктар“ клясава-варожым элемэнтам, Расьнянская РКК-РСІ паведамляе, што факты ў заметцы пацьвердзіліся. У лютым гэтага году калгас „Пражэктар“ быў распушчан. Арганізован цяпер новы калгас з беднякоў і лепшай часткай сераднякоў.

За слабае партыйнае кіраўніцтва калгасам пар тройкай РКК абвешчана сакратару Асінаўска партыйнай ячэйкі вымова.

Вымова за ўбой пароснай сьвіньні

Пятрыкоўская РКК паведамляе, што факты заметцы, аб убоі членам партыі Мусюковым п роснай сьвіньні адпавядаюць сапраўднасьці, за шт партыйнай ячэйкай вынесена Мусюкову вымов

КОЖНАЙ РАБОТНІЦЫ, КАЛГАСЬНІЦЫ, СЯЛЯНЦЫ І ЖОНЦЫ РАБОЧАГА

неабходна падпісацца на 1931 г.

НА ІЛЮСТРАВАНУЮ ЧАСОПІСЬ

„БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА“

Выданьне ЦК КП(б)Б
ВЫХОДЗІЦЬ 36 НУМАР. У ГОД

Часопісь ставіць сваёй задачай уздым палітычнага і культурнага ўзроўню работніц, калгасьніц, сялянак і жонак рабочых. Часопісь у форме, якая даступна малападрыхтаванаму чытачу, асьвятляе ўсе важнейшыя пытаньні палітычнага і гаспадарчага жыцьця краіны і міжнароднай палітыкі СССР.

У часопісі асьвятляюцца пытаньні перабудовы быту, выхаваньня дзяцей, вучобы і кваліфікацыі работніц, даюцца парады ўрача, агранома і г. д. Ёсьць літаратурна-мастацкі аддзел, друкуецца шмат заметак саміх чытачак, рабкорак і селькорак.

Часопісь зьяўляецца вялікай падмогай у працы сярод жанчын; яна дапамагае прыцягнуць адсталых і малапісьменных работніц і сялянак да актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве.

У 1931 годзе часопісьсю будуць даны дармовыя дадаткі

12 нумароў выкраек. 12 нумароў рукадзельнага лісту.

Падпісная цана: На 1 месяц — 20 к., на 3 месяцы — 60 к.
„ 6 „ 1 р. 20 к., „ 12 месяцаў 2 р. 40 к.

Цана асобнага нумару 10 кап.

Падпіска прымаецца: на пошце, лістаносцамі, упаўнаважанымі часопісі на прадпрыемствах і ў выдавецтве „Зьвязда“ (Савецкая, 63).

Выданьне ЦК КП(б)Б

Рэдактар Г. Рагазіньнікава.

Менск, друкарня імя Сталіна. Заказ № 801. 17.750 экз. Галоўлітбел № 434